ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ (з карновым дадаткам „Прафрух")
На 1 мес. . . — 90 к.
„ 3 мес. . . 2 р. 80 к.
„ 6 мес. . . 5 р. —
„ 12 мес. . . 9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ
За радок непр. пасьля тэксту—60 к., Іншагароднія абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы дарожэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Зьмін тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX-24 г. бярэцца 10 проц. дадатку.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „Зьвязда" Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

# ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар . . . . 10-74
Сакратар . . . . 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-80
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Аддзел падпіскі . 7-81
» абвестак . . 7-81

ПЯТНІЦА, 29 жніўня 1930 г.
№ 201 (3799)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

# СІЛАСНЫ ПРАРЫЎ ПАВІНЕН БЫЦЬ ЛІКВІДАВАНЫ

Сілас пад пагрозай. Магутнейшая зброя ў барацьбе за вырашэньне мясной праблемы, за сацыялістычную рэканструкцыю жывёлагадоўлі не выкарыстоўваецца. Сіласаваньне па сёнешні дзень злачынна зрываецца—плян сіласаваньня ня выконваецца. Лічбы сыгналізуюць вялізарнейшую небясьпеку—рэспубліканскі плян выкананы толькі па 1,1 проц. Калгасы БССР выканалі плян сіласаваньня менш чым на 2 проц. Плян выкананьня сіласаваньня кармоў і сіласнага будаўніцтва па саўгасах Беларусі выкананы менш чым на 1 проц.

Як цэнтральныя ўстановы, у першую чаргу НКЗ БССР, Белкалгасцэнтр, камсамол, так і раённыя арганізацыі мала, ганебна мала робяць у галіне сіласаваньня. Няма баявых, ударных, дзейсных тэмпаў у барацьбе за сіласнае будаўніцтва, за сіласаваньне кармоў.

**Так далей быць ня можа. Барацьба за сілас-ёсьць барацьба за вырашэньне мясной праблемы, за жывёлагадоўлю.** І таму ніякай павольнасьці, ніякіх марудных, злачынна-павольных тэмпаў на гэтым адказнейшым вучастку быць ня можа. Даволі спасыланьняў на аб'ектыўныя прычыны, на цяжкасьці, зьвязаныя з тым, што «сіласаваньне ёсьць новая справа». Плян сіласаваньня ня толькі зусім рэальны. Больш таго, яны могуць быць значна перавыкананы. Наша задача заключаецца ў тым, каб зьнішчыць праваапартуністычныя адносіны да сіласаваньня, каб рашуча ўдарыць па коснасьці, інэртнасьці, бюракратызьме і бязадказнасьці.

Практыка калгасу «Расьсьвет—Пераможца», калгасу «Прамень камуны», калгасаў Рагачэўскага раёну даводзіць, што пры баявых тэмпах у барацьбе за сіласаваньне, за вырашэньне мясной праблемы можна дабіцца вялізарных вынікаў. Калгасы «Расьсьвет—Пераможца» і «Прамень Камуны» бліскуча даводзяць, чаго можна дабіцца пры баявых, сапраўды ўдарных тэмпах барацьбы за сіласаваньне. Калгасы «Расьсьвет — Пераможца» і «Прамень камуны» скончылі будаўніцтва сіласных веж і ям. Гэтыя калгасы **поўнасьцю забясьпечылі сябе кармамі на гэты год.** Калгасы Рагачэўскага раёну за параўнаўча кароткі пэрыяд пабудавалі каля 100 сіласных ям. Гэта сьведчыць аб тым, што **там, дзе калгасы і саўгасы паўдарнаму, пабаяваму ўступілі ў барацьбу за сіласаваньне, там сілас будзе, там пад жывёлагадоўлю, пад сьвінагадоўлю будзе падведзена моцная кармавая база.**

Практыка калгасаў «Расьсьвет—Пераможца» і «Прамень Камуны» і баявы вопыт Рагачэўскага раёну яшчэ не пашраны. У большасьці месц раённыя арганізацыі, райкалгасаюзы, некаторыя райвыканкомы, асобныя акруговыя выканаўчыя камітэты ганебна бязьдзейнічаюць у барацьбе за сілас. У Менску, Магілеве, Воршы, Полацку акруговыя і раённыя партыйныя, камсамольскія і савецкія арганізацыі **бязьдзейнічаюць** у барацьбе за сілас. Заданьне па сіласным будаўніцтве і сіласаваньні кармоў ганебна сарвана. Ня гледзячы на **вялікую наяўнасьць сырцовай базы,** гэтыя округі і раёны ня выконваюць плянаў сіласнага будаўніцтва і сіласаваньня кармоў.

Стандартныя сіласныя вежы, якія выпускаюцца бабруйскім камбінатам, на мясцох ляжаць у разабраным відзе. Рабочыя-ударнікі бабруйскага камбінату, разгортваючы сацыялістычнае спаборніцтва, стварыўшы скразныя брыгады, перавыканалі заданьне па выпуску стандартных сіласных веж. На сёнешні дзень камбінат у выніку найшырэйшага сацыялістычнага спаборніцтва выпусьціў 75 сіласных веж. Але яны з-за **бюракратызму і інэрдбайнасьці** мясцовых арганізацый ляжаць па мясцох пад дажджом. Да гэтага часу прыступлена да зборкі толькі 5 сіласных веж. Ганебнейшы факт.—толькі для 9 веж гатовы фундаманты.

**Белкалгасбуд, Белмалжывсаюз** і інш. арганізацыі апраўдваюць сваю бязьдзейнасьць «аб'ектыўнымі» прычынамі. І Белкалгасбуд і Белмалжывсаюз крычаць аб тым, што няма драўляных і мэталёвых частак для зборкі сіласных веж. Зараз гэтыя прычыны зусім адпалі. Бабруйскі камбінат ва ўдарным парадку выпусьціў **75 камплектаў драўляных частак для веж.** «Союзколхозстрой» поўнасьцю завёз мэталёвыя часткі для зборкі стандартных сіласных веж. Ня гледзячы на гэта, сіласныя вежы **паранейшаму** на мясцох стаяць разабранымі. Белкалгасбуд і Белмалжывсаюз, убачыўшы, што спасылацца па адсутнасьць драўляных і мэталёвых частак для веж нельга, заяўляюць аб тым, што для зборкі стандартных сіласных веж няма рабочай сілы. Аднак, **ні адна гэтая ўстанова пальцам не паварушыла, каб хоць што-небудзь зрабіць па ўрэгуляваньні гэтага пытаньня.** Белкалгасбуд і Белмалжывсаюз паранейшаму шукаюць «аб'ектыўных» прычын, каб апраўдаць сваю поўную бязьдзейнасьць. Для нагляду за будаўніцтвам стандартных сіласных веж самае малае павінны быць мабілізаваны 23 кваліфікаваныя інструктары. СНК БССР з свайго боку пастанавіў мабілізаваць 15 інжынэрна-тэхнічных работнікаў для будаўніцтва сіласных веж. Аднак, на сёнешні дзень толькі 7 чалавек выехалі на месцы. Гомельскі Сельмаш да гэтага дня не дабіўся карэннага зруху ў выкананьні прамфінпляну па выпуску сіласарэзак. У выніку зрыву прамфінпляну па Гомельскім «Сельмашы» завоз сіласарэзак выкананы толькі на 50 проц.

Так далей быць ня можа. Да суровай адказнасьці тых, хто зрывае выпуск сіласарэзак, хто тармозіць зборку стандартных сіласных веж. Вышэйсьцяг сацыялістычнага спаборніцтва на бабруйскім камбінаце, на гомельскім «Сельмашы»! Сацыялістычная прамысловасьць павінна поўнасьцю выканаць заказ на вежы і сіласарэзкі. Калгасы і саўгасы павінны ў тэрмін, бяз усякіх адступленьняў ад плянаў, атрымаць стандартныя вежы і сіласарэзкі. Ударнікі гэтых прадпрыемстваў павінны прыкласьці ўсе свае сілы, каб плян вытворчасьці сіласных веж і сіласарэзак быў ня толькі выкананы, але і перавыкананы.

Месцы, раёны, калгасы і саўгасы не павінны дапускаць ніякай марудносьці ў зборцы веж. Усякая павольнасьць—зараз злачынства.

Трэба з усёй катэгарычнасьцю адкінуць прэч спробы бюракратаў і апартуністых, якія сарвалі плян сіласаваньня, спасылацца на тое, што няма сырцу для сіласаваньня. Паслухайце пра што гаворыць факты. Дажджлівы час у гэтым годзе выклікаў значны рост атавы. Бульбянік можа даць **49 млн.** падвойных цэнтнэраў сіласу! І атава, і бульбянік, і інш. кармавыя травы і кораньплоды—вялізарнейшы ўклад для сіласаваньня. **Патрэбна толькі баявая мабілізацыя ўсіх сіл, патрэбны толькі ўдарныя тэмпы і сілас будзе.** Сілас павінен быць і ён будзе.

На барацьбу за сілас павінен мабілізавацца **саюз с.-г. рабочых,** павінен мабілізавацца **камсамол, аграномы, навуковыя сілы** і г. д. Хіба-ж да сёнешняга дня камсамол дабіўся рэальных вынікаў у сваёй рабоце па сіласаваньні? Хіба-ж аграномы і інш. спэцыялістыя сельскай гаспадаркі прыцягнуты ў выстарчальнай меры на барацьбу за сілас? Не, далёка не. Шмат слоў і мала, злачынна мала творчай работы, ганебна мала дзейснай барацьбы за сілас. Спэцыялістыя сельскай гаспадаркі павінны поўнасьцю мабілізавацца на сіласны фронт. Тут больш, чым дзе-небудзь, патрэбны практычныя парады, патрэбны вопыт і практыка спэцыялістых. Не сакрэт, што ў большасьці месц якасьць сіласаваньня ня вытрымлівае ніякай крытыкі. У шмат якіх раёнах сіласныя ямы рыюцца абыяк, яны не абліцоўваюцца і зялёная маса сіласуецца з рук вон дрэнна. У выніку сілас гніе і ня прыносіць ніякае карысьці. Такая пастаноўка сіласаваньня толькі падрывае і зьневажае вялізарную ролю сіласу, як магутнага вагара ў барацьбе за вырашэньне кармавое праблемы.

Саюз с.-г. рабочых, спэцыялістыя сельскай гаспадаркі, камсамольскія арганізацыі павінны **на справе** мабілізавацца на барацьбу за сілас. Камсамольцы, прафсаюзы, агарномы, спэцыялістыя сельскай гаспадаркі на баявыя пазыцыі адказнейшага фронту барацьбы за сілас! Далей нельга губляць ні аднэй хвіліны. Далейшая павольнасьць—злачынства. Памятайце,—мы можам шмат яшчэ зрабіць. У нашым распараджэньні магутная база сырцу для сіласаваньня.

Ніякай марудносьці і павольнасьці!

Правыя апартуністыя ігнаруюць сілас. Яны сваім ігнараваньнем сіласу льлюць ваду на млын клясавага ворага, занамагаюць кулацтву, якое шалёна прабуе атакаваць фронт жывёлагадоўлі. Дамо руйуючы адпор кулацтву і яго праваавартуністычнай агентуры! Мы цьвёрда памятаем, што барацьба за сілас—ёсьць барацьба за вырашэньне мясной праблемы, за рэканструкцыю жывёлагадоўлі. Наперакор бюракратам, апартуністым, наперакор шалёнаму супраціўленьню кулацтва мы выканаем плян сіласаваньня. Мы падвядзем пад жывёлагадоўлю магутную кармавую базу.

Мы павінны перамагчы па сіласным фронце. І мы пераможам.

# ТРЫВОЖНЫЯ ВЕСТКІ

## з ільнаводных раёнаў

## УБОРКА ІЛЬНУ ПАЧАЛАСЯ, ДА ЎБОРКІ НЕ ГАТОВЫ

Будаўніцтва ільнаапрацоўчых прадпрыемстваў зрываецца. Толькі цяпер ільна-пяньковае аб'яднаньне схамянулася. Галавацяпскі праект і галавацяпская пабудова дрысенскага заводу. 10.000 тон ільнавалакна ў небясьпецы. Чаму ВСНГБ адмаўляецца ад пабудовы заводу?

**ЗАВОДЫ І ФАБРЫКІ, ВАЗЬМЕЦЕ НА БУКСІР ІЛЬНАВОДНЫЯ РАЁНЫ! РАБОЧЫЯ БРЫГАДЫ--- НА ФРОНТ УБОРКІ ІЛЬНУ!**

### Лён патрабуе

У ільнаводных раёнах Беларусі пачалася ўборачная кампанія ільну. У бягучым годзе перад уборкай ільну стаяць выключна складаныя і вялікія задачы. Пасеўная плошча ільну значна пашырана. **Калгасы і саўгасы вясной паказалі бальшавіцкія тэмпы работы і перавыканалі пасеўны плян.**

Цяпер зён пасьпеў і патрабуе своячасовай уборкі. Ці ўсе ільнаводныя раёны падрыхтаваны да яе? **Далёка не.** Ва ўборачнай кампаніі ільну ёсьць глыбокія і сур'ёзныя прарывы. Аб гэтым выразна сьведчаць матар'ялы, якія друкуюцца ў сённяшнім нумары **«Зьвязды».** Ільнаводныя калгасы і саўгасы задыхаюцца ад недахопаў рабочай сілы, а мясцовыя органы працы захоўваюць алімпійскі спакой. Пытаньне аб рабочай сіле павісла ў паветры. На мясцох літаральна нічога ня зроблена і ня робіцца, каб ліквідаваць дэфіцыт у рабочай сіле.

Першапачатковая апрацоўка ільну стаіць пад сур'ёзнай пагрозай. Ільнаводы не пабудаваны. На будаўніцтве гэтых заводаў пануе злачынны самацёк, агідная безгаспадарчасьць, бязадказнасьць, а часамі простае шкодніцтва. Факты, якія паведамляюцца ў карэспандэнцыі **«Трывога»** зьмешчанай ніжэй, выклікаюць сапраўднае абурэньне. Завод рэспубліканскага значэньня другі год будуецца, але невядома, калі будзе скончаны. Праз год, выдатказаўшы на будаўніцтва дрысенскага заводу дзесяткі тысяч рублёў, ВСНГБ пераконваецца, што пабудову **трэба спыніць. 10.000 тон ільну, якія дасьць дрысенскі раён, няма дзе апрацаваць.** І такія факты не зьяўляюцца выключэньнем. Нам паведамляюць, што будаўніцтва Лязьнянскага, Шклоўскага і інш. ільназаводаў таксама стаіць на парозе поўнага правалу. Нельга цярпець далей такога агіднага становішча. Да самай суровай адказнасьці бюракратаў і апартуністых, якія правальваюць будаўніцтва пляны і ставяць пад пагрозу ўборачную кампанію ільну. Мы патрабуем прыняцьця баявых надзвычайных мерапрыемстваў. Нельга ні хвіліны марудзіць.

Рабочыя і работніцы прадпрыемстваў БССР павінны яшчэ раз паказаць прыклад пралетарскай сьвядомасьці і кінуць у ільнаводныя калгасы і саўгасы сваіх брыгадзіраў. Рабочыя брыгады—на дапамогу калгасам і саўгасам ўборцы ільну—гэты лёзунг павінен быць у бліжэйшыя дні ператвораны ў жыцьцё. Заводы і фабрыкі, бярэце на буксір ільнаводныя калгасы і саўгасы. Дапамажэце калгасьнікам лён, засеяны пабальшавіцку ўбраць у тэрмін.

Будаўніцтва ільназаводаў павінна быць скончана ў першачарговым парадку. Над суд тых, хто зрывае будаўніцтва. Жалезнай мятлой пралетарскага кантролю неадкладна вымесьцім лён, засеяны пабальшавіцку, цем з пабудоў ільнаводаў безгаспадарчасьць, бясплянавасьць, нядбайнасьць, бюракратызм, шкодніцтва. Шырэй разгорнем сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва па пабудовах. **Ільназаводы павінны быць.**

### Рэкорд безадказнасьці

**«Зьвязда»** ня раз сыгналізавала аб марудных тэмпах будаўніцтва ільнаапрацоўчых заводаў. На жаль і сёньня мы прымушаны канстатаваць, што будаўніцтва ільназаводаў праходзіць злачынна **слаба.** Будаўнічыя арганізацыі **ня ўжываюць** ніякіх захадаў да своячасовага выкананьня плянаў будаўніцтва.

**Лёзьнянскі** ільнаапрацоўчы завод павінен быць пушчаны ў сьнежні гэтага году. Аднак, пры сёнешніх тэмпах пабудовы завод у бягучым годзе ні ў якім разе **ня будзе скончаны.** Завод будуецца Белкалгасбудам, але апошні зусім **не клапаціцца** аб своячасовым скончэньні пабудовы.

У такім-жа становішчы знаходзіцца будаўніцтва шклоўскага ільназаводу, якое вядзецца Белдзяржбудам. 1-га жніўня завод павінен быць пушчаны ў ход, аднак, дагэтуль амаль яшчэ **не пачата** будаўніцтва.

Прэзыдыум ВСНГБ пастанавіў лічыць будаўніцтва ільнаапрацоўчых заводаў **першачарговым.** Але што значыць гэтая пастанова, калі за ёй не пасьледвала практычная работа. Мала пастанавіць, трэба забясьпечыць выкананьне пастаноў. Гэтага ВСНГБ **не зрабіў.** Ільнапяньковае аб'яднаньне зараз паставіла пытаньне перад ВСНГБ пра абвяшчэньне будаўніцтва ільназаводу ўдарным. Калі схамянуліся! Замест энэргічных і баявых практычных мерапрыемстваў ільнапяньковае аб'яднаньне абмяжоўваецца яшчэ аднэй папяровай пастановай. Вінаватыя ў зрыве будаўніцтва ільназаводаў павінны быць сурова пакараны. Ільназаводы павінны быць. Даволі злачыннай бязьдзейнасьці.

С.

**Ад нашага карэспандэнта**

### ТРЫВОГА

**ДРЫСЕНСКІ** раён зьяўляецца буйным ільнаводным раёнам Попаччыны. 22 проц. засеўнай плошчы раёну знаходзіцца пад ільном. Ураджай ільну сёлета сярэдні. Адзін гэктар дасьць прыкладна звыш 300 кілё ільнавалакна. Апрача ільна-насеньня, у раёне мяркуецца атрымаць каля **10.000 ТОН** ільнавалакна.

Уборка ільну ўжо **ПАЧАЛАСЯ.** Між тым, ільнаводныя калгасы і адзінаасобныя гаспадаркі да ўборачнай кампаніі **НЕ ПАДРЫХТАВАЛІСЯ.** На шляху ўборкі стаяць вялікія перашкоды. У першую чаргу яны заключаюцца ў **ПОЎНАЙ НЕПАДРЫХТАВАНАСЬЦІ** раённых арганізацый да ўборачнай кампаніі, у злачынным зрыве будаўніцтва ільнаапрацоўчага заводу і г. д. Увесну раённыя ўстановы горача агітавалі за пашырэньне засеўнай плошчы ільну, а зараз ніхто з іх нават і ня думае, як яго ўбраць.

У Дрысе павінен быць пабудаваны ільназавод рэспубліканскага значэньня. Будаўніцтва пачалося яшчэ летась 1-га верасьня Дрысенскі ільназавод павінен быць пушчаны ў ход. Аднак, будаўніцтва яшчэ не разгорнута. Будаўнічыя пляны ганебна **ПРАВАЛЕНЫ.**

Будаўніцтва заводу паралізавана безгаспадарчасьцю і бясплянавасьцю. Работа вядзецца **АБЫЯК.** На будаўніцтва выдаткавана ўжо 118 тысяч рублёў, а карысьці **НІЯКАЙ.** Каштоўныя замежныя машыны ляжаць пад адкрытым небам (напрыклад, імпартныя ільнамялкі, якія каштуюць 5.000 руб.).

Плян будаўніцтва ільназаводу складаўся па-галавацяпску. У пляне дапушчаны такія недарэчнасьці, якія мяжуюцца са злачынствам, з простым шкодніцтвам. Пры складаньні пляну зусім забыліся пра пабудову мачыльнай ямы і сушні. Мочка і сушка ільнавалакна — самая складаная і цяжная работа, якую па віне гора-будаўнікоў прыдзецца рабіць самім пасеўшчыкам ільну. Ільназавод будзе стаяць без нагрузкі. Злачынкае галавацяпства.

У ільнаводных калгасах і адзінаасобных гаспадарках ня хопіць рабочай сілы для першапачатковай апрацоўкі ільну. Зараз калгасы («ГІГАНТ», імя ДЗЯЖЫНСКАГА і інш.) задыхаюцца ад недахопу рабочых рук. Уборка ільну знаходзіцца пад сур'ёзным ударам. А аб першапачатковай апрацоўцы ільну няма чаго і гаварыць. Пры наяўнай рабочай сіле лён ня будзе апрацаваны. Засеўшчыкам ільну было сказана, што будуецца завод, які прыме ад іх лён без апрацоўкі. А зараз выяўляецца, што, папершае, будаўніцтва ільназаводу фактычна не праводзіцца, а па-другое, ільназавод, нават калі ён будзе скончаны, ня здолее прыняць неапрацаваны лён.

Раённыя ўстановы пальцам не паварушылі, каб папярэдзіць катастрофу, якая надыходзіць. Раённы выканком адкрыта заяўляе, што «гэта ня наша справа». Райком партыі ні аднаго разу не абмеркоўваў пытаньня аб будаўніцтве ільназаводу. У наяўнасьці поўная недастачка ільну, як важнейшага сырцу для нашай тэкстыльнай прамысловасьці. У наяўнасьці грубейшае ігнараваньне ільну з боку дрысенскага кіраўніцтва. Што для іх азначаюць дырэктывы партыі і ўраду аб разьвіцьці ільну, як адзін з галоўных тэхкультур? Нічога. І райком партыі, і райвыканком ня хочуць аддаваць уборцы ільну і будаўніцтву заводу хоць бы невялікай увагі.

Як рэагуе ВСНГБ на правал будаўніцтва ільназаводу? Зараз ВСНГБ, дапусьціўшы зрыў будаўнічых плянаў, санкцыянаваўшы галавацяпскі праект па будовы, выракаецца будаўніцтва. ВСНГБ ударыўся ў паніку, заяўляючы, што «наўрад ці мы будзем будаваць гэты завод, бо будаўніцтва пастаўлена няўдала. Грунт кепскі, пабудова знаходзіцца далёка ад чыгункі і г. д.». Праз год, затраціўшы дзесяткі тысяч рублёў, ВСНГБ прыходзіць да вываду, што пабудова пастаўлена няўдала. Аб чым работнікі ВСНГ думалі раней? Чаму яны пачалі будаваць завод там, дзе ён не павінен быць, на дрэнным грунце, далёка ад чыгункі?

**МЫ Б'ЕМ ТРЫВОГУ. 10.000 ТОН ІЛЬНУ ЗНАХОДЗЯЦЦА Ў ВЯЛІКАЙ НЕБЯСЬПЕЦЫ. ВАЖНЕЙШАЕ БУДАЎНІЦТВА, АД ЯКОГА ЗАЛЕЖЫЦЬ ЛЁЎ ІЛЬНАВОДЗТВА Ў ДРЫСЕНСКІМ РАЁНЕ ПРАВАЛЕНА. ПАТРЭБНЫ НАДЗВЫЧАЙНЫЯ, НЕАДКЛАДНЫЯ МЕРЫ. ЯШЧЭ НЯ ЎСЁ ЗГУБЛЕНА. ДРЫСЕНСКІ ІЛЬНАЗАВОД ПАВІНЕН БЫЦЬ ПАБУДАВАНЫ.**

Курган.

*Абсьледваньне работы КП(б)Б*

## На нарадзе пры ЦК

Учора адбылася нарада мабілізаваных ЦК КП(б)Б таварышоў у дапамогу адказным інструктарам ЦК УсеКП(б) для ўдзелу ў абсьледваньні КП(б)Б.

Адказны інструктар ЦК УсеКП(б) тав. **ГІЛІНСКІ** зрабіў інструкцыйны даклад аб задачах, зьместе і мэтадах абсьледваньня работы КП(б)Б.

Дзьве задачы пастаўлены абсьледваньнем: 1) Даць крытычную ацэнку ўсёй работы КП(б)Б і 2) на падставе гэтага вызначыць рад мерапрыемстваў далейшага гаспадарча-культурнага разьвіцьця БССР.

Патрэбна ня толькі сабраць і канстатаваць факты, але ва ўсіх галінах работы вызначыць далейшыя шляхі і тэмпы разьвіцьця.

Агляд работы прафсаюзаў, прамысловасьці, савецкага будаўніцтва павінен дапамагчы высьвятленьню якасьці партыйнага кіраўніцтва.

Тав. Гілінскі падрабязна высьвятліў задачы абсьледваньня ў галіне прамысловасьці, сельскае гаспадаркі, саматужнай прамысловасьці, культурна-бытавога абслугоўваньня, савецкага будаўніцтва, вырашэньня нацыянальнай палітыкі і г. д.

Для абсьледваньня вызначаны пэўныя аб'екты—раёны, саўгасы, калгасы, прадпрыемствы, установы. У ножны пункт выяжджае брыгада на чале з кіраўніком, якая на месцы прыцягвае да працы мясцовы актыў з рабочых, ударнікаў, калгасьнікаў, батрацтва, беднаты.

У наступных пунктах будзе праводзіцца абсьледваньне па ўсіх галінах работы: **Гомель** (горад), **Тураўскі раён, Дрысенскі, Асьвея, Койданаўскі, Талачынскі, Горацкі, Клімавіцкі, Шклоўскі, Бабруйскі, Старобінскі, Плешчаніцкі, Ліёзна.**

Выбарачнае абсьледваньне па пытаньнях сельскай гаспадаркі—**Самахвалавіцкі** раён—і прадпрыемствы: завод **«Домбаля»** (Барысаў), **фасфарытны і цэмэнтны** заводы (Крычаў). **«Дзьвіна»** (Віцебск), **Асінбуд і Асінторф, Аршанскі чыгуначны вузел, «Бальшавік»** (Менск), **цагельні 3 і 8** (Менск).

Акрамя гэтага, будзе праведзена праверка работы **ЦСПСБ, ЦК чыгуначнікаў, ЦК дрэваапрацоўшчыкаў, ЦК сельгасрабочых, Белсампрамсаюз і менскі райсаюз.**

Усе мабілізаваныя т. т. выяжджаюць сёньня ў вызначаныя пункты. Арыентыровачна мяркуецца, што абсьледваньне ў вызначаных пунктах скончыцца за два тыдні.

## Пілсудзкі абяцае разагнаць сойм

ВАРШАВА, 28. Сёньня ва ўрадавай прэсе апублікавана **дэклярацыя Пілсудзкага.**

У першай частцы дакладу, данай у форме **інтэрв'ю,** Пілсудзкі «наогул пачынае сумнявацца ў **карысьці парлямантарызму»** і рэзка крытыкуе польскую канстытуцыю, якая зьяўляецца такой неахайнай, што яна стварае толькі паўнейшы юрыдычны хаос. Кожны з дэпутатаў сойму тлумачыць канстытуцыю як хоча, і ў выніку канстытуцыя абарачаецца ў звычайную **вулічную дзеўку.**

Пілсудзкі заяўляе далей, што перад кожным прэм'ерам звычайна стаіць маса розпастайных і цяжкіх пытаньняў і з усёй гэтай масы ён павінен выбраць **асноўныя пытаньні,** якія сапраўды маюць сур'ёзнае значэньне для данага моманту. Такім галоўным пытаньнем Пілсудзкі лічыць **пытаньне аб зьмене канстытуцыі.**

У другой частцы свайго інтэрв'ю Пілсудзкі абрушваецца на сойм і, на прыкладу мінулых сваіх заяў, лае дэпутатаў **нягоднікамі, бандай, зграяй, якая імкнецца як мага больш атрымаць матар'яльных сродкаў ад дзяржавы і г. д.** Пілсудзкі рэкамэндуе ўладам ня толькі пнаць тых дэпутатаў, якія зьвяртаюцца да іх па тых, або іншых справах, **але і накладваць ім па шыі.** У гэтай частцы гутарка перапоўнена ўжо вядомымі выразамі аб расьцёгнутых сьмярдзючых дэпутацкіх майтках, ад смуроду якіх залезьліць дзяржава і г. д. Пілсудзкі заяўляе, што такое становішча, пры якім банда пятнаццаці, якая сабралася ў колькасьці, прыкладна, 100 чал., можа дыктаваць сваю волю дзяржаве, зусім немагчыма.

Характарызуючы такім чынам сойм, Пілсудзкі падкрэсьлівае, што ўсе яго «вызначэньні» не адносяцца **да беспартыйнага блёку.**

У далейшым Пілсудзкі зьдзекуецца ўжо непасрэдна над **цэнтралевай апазыцыяй,** называючы яе сходам падлюг, абвінавачваючы дэпутатаў у «карупцыі» і г. д. Адзіным выйсьцем з гэтага хаосу, па думцы Пілсудзкага, зьяўляецца зьмена канстытуцыі.

У палітычных колах у сувязі з выступленьнем Пілсудзкага лічаць, што пытаньне аб лёсе сойму высьветліцца **не раней канца кастрычніка.** Лічаць, што ў кастрычніку бюджэтная сэсія будзе адтэрмінавана на адзін месяц **да канца лістапада.** Толькі да таго часу высьветліцца асноўнае пытаньне, ці адважыцца Пілсудзкі на ўвядзеньне новай канстытуцыі ў парадку дэкрэту, або спрабуе зрабіць выбары на старой аснове з тым, каб ужо **пасьля гэтых выбараў прыняць канчатковую пастанову. Харантэрна,** што Пілсудзкі зусім не закрануў ні гаспадарчых, ні палітычных, ні ў прыватнасьці **знадворна-палітычных пытаньняў.**

# ДАПАМОЖАМ АГЛЯДУ РАБОТЫ КП(б)Б

У кастрычніку камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі будзе рабіць справаздачу перад Цэнтральным Камітэтам нашай партыі аб стане і рабоце КП(б)Б. Справаздача нашай арганізацыі перад ЦК УсеКП(б) мае вялізарнейшае палітычнае значэньне. Наша арганізацыя праверыць наколькі яна пасьпяхова ажыцьцяўляе генэральную лінію партыі на самым заходнім вучастку Саюзу, ва ўмовах складанага нацыянальнага пераплёту і пагранічнага становішча з фашысцкай Польшчай.

Справаздача мае і вялікае практычнае значэньне, паколькі мы атрымліваем магчымасьць у гэтым дакладзе паставіць рад палітычных і гаспадарча-культурных праблем. Для падрыхтоўкі дакладу аб стане і рабоце КП(б)Б, абсьледваньні ее работы і распрацоўкі патрэбных мерапрыемстваў, Цэнтральны Камітэт партыі камандыраваў да нас сваіх адказных інструктароў. Прыехаўшыя таварышы ўжо прыступілі да работы.

Праграма абсьледваньня ахапляе ўсе асноўныя палітычныя, гаспадарчыя і культурныя пытаньні будаўніцтва Савецкай Беларусі. Асноўным зьместам праграмы абсьледваньня нашай арганізацыі зьяўляецца «праверка работы партарганізацыі Беларусі з пункту погляду кіраўніцтва асноўнымі пытаньнямі будаўніцтва БССР. Абсьледваньне павінна ня толькі выявіць стан работы беларускай арганізацыі, але і вызначыць разам з ёю рад мер гаспадарча-культурнага разьвіцьця Беларусі».

Уся праверка павінна паказаць наколькі беларуская арганізацыя перабудавала сваю работу ў адпаведнасьці з тымі задачамі, якія стаяць перад нашай партыяй, як наша арганізацыя ўядзе змаганьне за генэральную лінію партыі — з правым ухілам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе рэвалюцыі, рэцыдывамі трацкізму і «левымі» загібамі. Праверка павінна выявіць, як наша беларуская арганізацыя вырашае нацыянальнае пытаньне і як яна вядзе змаганьне з ухіламі ад лініі партыі ў нацыянальным пытаньні — з вялікадзяржаўным расійскім і мясцовымі шавінізмамі.

Трэба будзе даць адказ ці правільна выбраны напрамак разьвіцьця нашай прамысловасьці і ці адпавядаюць тэмпы разьвіцьця прамысловасьці нашым задачам, як ідзе ў нас сацыялістычная рэканструкцыя сельскае гаспадаркі, як сацыялістычны сэктар сельскае гаспадаркі ўзьдзейнічае на адзінаасобныя бядняцка-серадняцкія гаспадаркі.

Вось асноўныя пытаньні абсьледваньня.

Праграма абсьледваньня робіць упор на пытаньні разьвіцьця саматужнай прамысловасьці з пункту погляду скарыстаньня магчымасьцяй саматужнай прамысловасьці для сацыялістычнага будаўніцтва.

Важнейшай часткай праграмы абсьледваньня зьяўляюцца пытаньні культурна-бытавога абслугоўваньня — усеагульнае навучаньне і ліквідацыю няпісьменнасьці, ліквідацыя фактычнае няроўнасьці ў культурным разьвіцьці раней прыгнечаных нацыянальнасьцяй Беларусі (беларусы, яўрэі, палякі і г. д.). Асаблівая ўвага будзе зьвернута на пытаньні беларусізацыі, выхаваньня кадраў з карэннай нацыянальнасьці. Як мы рыхтуем кадры, як вылучаем і арабочваем нашы апараты — зьяўляецца цэнтральным пытаньнем абсьледваньня.

Адназ з важнейшых задач зьяўляецца «праверыць стан нізавых партарганізацый, ступень уменьня іх кіраваць будаўніцтвам на прадпрыемствах і на вёсцы». Праверка павінна выявіць, як скарыстоўваўся творчы энтузіязм рабочых мас, як працуюць саветы, прафсаюзы, каапэрацыйная сетка, камсамол. Пытаньні выкананьня фінансавага пляну будуць займаць важнейшае месца ў абсьледваньні.

Усё абсьледваньне павінна даць малюнак стану ўцягненьня шырокіх мас рабочых, калгасьнікаў, беднаты, серадняку у сацыялістычнае будаўніцтва, стану разгортваньня самакрытыкі, барацьбы з зацiскам самакрытыкі, забясьпячэньня ўнутрыпартыйнай прапетарскай дэмакратыі ва ўсіх зьвяньнях КП(б)Б, прафсаюзах, саветах.

Гэта вялізарная работа па абсьледваньні можа быць праведзена добра і ў адносна кароткі тэрмін толькі пры актыўным падтрыманьні ўсіх членаў партыі, рабочых, калгасных, бядняцка-серадняцкіх мас вёскі, пры актыўным падтрыманьні ўсіх арганізацый і ўстаноў. ПРАВЕРКА РАБОТЫ КП(б)Б ПАВІННА БЫЦЬ ПЕРАТВОРАНА Ў АГЛЯД РАБОТЫ НАШАЙ АРГАНІЗАЦЫІ. ЧЫМ БОЛЬШ БУДЗЕ ВЫЯЎЛЕНА ІНІЦЫЯТЫВЫ, САМАДЗЕЙНАСЬЦІ З БОКУ ЎСІХ ПАРТЫЙНЫХ, ПРАФСЬЯНАЛЬНЫХ, КААПЭРАЦЫЙНЫХ І САВЕЦКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ У ГАЛІНЕ ПАСТАНОЎКІ НОВЫХ ПРАБЛЕМ, УЛІКУ ВОПЫТУ РАБОТЫ, ЧЫМ БОЛЬШ БУДЗЕ РАЗГОРНУТА САПРАЎДЫ БАЛЬШАВІЦКАЯ САМАКРЫТЫКА, ТЫМ БОЛЬШ ПОЎНЫМ, ТЫМ БОЛЬШ ПРАВІЛЬНЫМ БУДЗЕ МАЛЮНАК СТАНУ І РАБОТЫ НАШАЙ АРГАНІЗАЦЫІ.

Вельмі важна выяўленьне ўсіх сапраўдных недахопаў у нашай рабоце. Яшчэ раз падкрэсьліваем, што разгортваньне сапраўды бальшавіцкай самакрытыкі зьяўляецца абсалютна неабходным.

Уся работа па абсьледваньні КП(б)Б і падрыхтоўцы да дакладаў у ЦК УсеКП(б) адбываецца ў абставінах выкананьня раду надзвычай важных гаспадарчых і культурных палітычных задач. Мы павінны ў працягу верасьня ліквідаваць прарывы ў галіне выкананьня прамфінпляну, скончыць уборку, па-баявому правесьці асеньнюю пасеўную кампанію, разгарнуць хлебазагатоўкі. Чаго гэта-б ні каштавала—выканаць праграму сіласаваньня, працаваць над далейшым ўцягненьнем у калгасы бядняцка-серадняцкіх мас. Нам трэба забясьпечыць праграму ўсагульнага навучаньня і разгортваньня работы ўсіх вызначаных ВНУ, ВТНУ, тэхнікумаў і школ. Уся праверка работы КП(б)Б павінна быць скарыстана для паскарэньня тэмпаў вырашэньня ўсіх гэтых задач, для больш хуткага выпраўленьня недахопаў.

Скарыстаць праверку для яшчэ лепшай мабілізацыі мас супроць клясавага ворага для далейшага наступленьня на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва — зьяўляецца нашай важнейшай задачай.

За бальшавіцкую крытыку недахопаў, за ўдзел МАС у праверцы работы КП(б)Б,

# Праверыць, у якіх умовах працуюць вылучэнцы!

*Перамагчы супраціўленьне бюракратычных і сацыяльна варожых элемэнтаў арабочаньню дзяржаўнага апарату*

**Дырэктывы партыі павінны быць выкананы**

## Адсутнасьць дапамогі прымушае ўцякаць

### У Белкаапсаюзе супрацоўнік Гармізэ цкуе вылучэнца

Арабочаньне дзяржаўнага савецкага і кааперацыйнага апарату партыя высунула, як адну з важнейшых задач. Аднак, рад устаноў і парт'ячэек не ўзяліся, як сьлед за практычнае ажыцьцяўленьне гэтай задачы. Не гаворачы пра тое, што вылучэньне рабочых у дзяржаўны апарат адбываецца марудна, мы ў радзе ўстаноў маем недапушчальныя адносіны да рабочых вылучэнцаў. Іх ня вучаць працаваць, ім не дапамагаюць, а часам нават ігнаруюць.

Для прыкладу возьмем дзьве ўстановы: **НКФ і Белкаапсаюз.** У бягучым годзе для работы ў апараце НКФ пасланa 9 рабочых-вылучэнцаў. Зараз яны ўсе працуюць інструктарамі.

Як яны працуюць?

На гэта пытаньне не дасьць адказу ні партыйная ячэйка, ні кіраўнікі ўстановы. Бо ніхто з іх работай вылучэнцаў ня цікавіўся. Аб гэтым выразна і зусім адкрыта заяўляюць самі вылучэнцы. Тав. **Залескі** гаворыць: «вось хутка год, як я працую ў апараце НКФ на пасадзе інспэктара па прыбытках лясоў. Побач з гэтым выконваю абавязкі інспэктара на пазыках. Як на першай, так і па другой галіне я работы добра ня ведаю, між тым ніхто мне ў рабоце не дапамагае. Парт'ячэйка вылучэнцамі ня цікавіцца». Такія абставіны прымушаюць уцякаць вылучэнца з работы.

**Т. Залескі** падаў заяву ў бюро ячэйкі аб тым, каб яго адпусьцілі на завод.

Прыблізна тое-ж самае гаворыць т. Эйдлін, які працуе ў падатковай частцы НКФ.

Партыйная ячэйка нават ні разу не пагаварыла з вылучэнцамі, не пацікавілася тым, у якіх абставінах ім даводзіцца працаваць.

Ня лепшая справа і **ў Белкаапсаюзе,** у апараце якога працуе **20** вылучэнцаў. У Белкаапсаюзе на вылучэнца глядзяць так, што яго можна бясконца, бяз меры перакідаць з аднэй работы на другую. Як раз так было з вылучэнцам т. Чаусавым. Яго на працягу паўгода тры разы перакідалі з аднэй работы на другую.

Кіраўніцтва і дапамогі ў рабоце вылучэнцаў як з боку адміністрацыі, так і з боку парт'ячэйкі — няма. Нават і з боку парт'ячэйкі — няма. Больш таго, — вакол вылучэнца т. **Камейка** складаюць немажлівыя ўмовы работы. Супрацоўнік Белкаапсаюзу **Гармізэ** адмаўляецца дапамагаць у рабоце т. Камейка, па адрасе яго распускае розныя плёткі, завязвае склокі.

Тыя рабочыя калектывы, якія вылучылі сваіх таварышоў на работу ў НКФ і Белкаапсаюз, ня цікавяцца, як яны спраўляюцца з работай.

**П. Скокаў.**

## Прадастаўлены самі сабе

Абставіны, у якіх даводзіцца працаваць вылучэнцам у НКА, назваць добрымі нельга. З першага-ж дня, як толькі вылучэнцы зьявіліся ў наркамат для работы, іх не ўвялі, як сьлед у курс справы іх абавязкаў. Вылучэнец — рабочы прыходзіў да наркома, нарком прызначаў на пасаду, а пра тое, якія на таварыша ўскладаюцца абавязкі, з чаго ён павінен пачаць сваю работу, не гаварыў ні слова. Так было з вылучэнцам **т. Вожыкам,** так было і з радам іншых таварышоў.

Калі т. Вожык першы дзень прышоў на работу ў НК яму заявілі: «ты будзеш працаваць намесьнікам наркома, будзеш загадваць пытаньнем падрыхтоўкі кадраў сярэднімі навучальнымі установамі. На гэтым і скончана «ўвядзоньне ў курс справы» рабочага вылучэнца.

Вылучэнец садзіцца за работу. Дапамогі няма ні з боку наркома, ні з боку парт'ячэйкі. Калі зьвернецца вылучэнец да каго-небудзь з работнікаў апарату, дык ён адкажа. Але-ж гэтага мала. Патрэбна штодзённае інструктаваньне, патрэбна дапамога з боку парт'ячэйкі, кіраўніцтва і спэцыялістых. А гэтага штодзённага кіраўніцтва работай вылучэнцаў у НКА няма.

Работніца т. **Лебедзева** — адна з першых вылучэнак у НКА. Першыя 6 месяцаў т. Лебедзева працавала ў дашкольным аддзеле. У рабоце дапамогі ня было. У першыя дні ня ведала за што ўзяцца. Ні адзін работнік апарату НКА, пачынаючы ад машыністкі і канчаючы інспэктурай, ёй у рабоце не дапамагаў. Тав. Лебедзева сустрэлася з фактамі ігнараваньня яе, як вылучэнкі. Адна з машыністак адмовілася друкаваць напісаную т. Лебедзевай паперку ў сувязі з тым, што яна была **з граматычнымі** памылкамі.

У той час, калі наркаматам кіраваў Баліцкі, ён ня толькі ня гутарыў з вылучэнцамі, а нават не паказваўся ім на вочы. Пасьля 6-цімесячнай работы т. Лебедзева была накіравана на 6-цімесячныя курсы ў Маскву. Па сканчэньні курсаў ніяк не магла знайсьці асобы, ад якой належала прыняць справы дашкольнага аддзелу. Такой асобы не аказалася. І калі яна зьвярнулася да наркома, дык ён адказаў: «складай пляны работы, потым з ім прыдзі да мяне».

А хто дапаможа выпрацаваць плян?

Пра гэта не сказаў ні нарком і ні адзін работнік апарату НКА.

Партыйная ячэйка не дапамагае ў рабоце вылучэнцам, не заслухоўвае іх справаздач. Бюро партыйнай ячэйкі заслухала даклад вылучэнца т. Вожыка толькі пасьля таго, калі ён аб гэтым некалькі раз напомніў.

Бюро парт'ячэйкі вынесла пастанову аб штомесячным праведзеньні нарад з вылучэнцамі. Але гэта пастанова засталася на паперы.

**ФАРБЕРАЎ.**

## Вылучэнцам не дапамагаюць

У апараце **Наркамгандлю** працуе 9 вылучэнцаў, з якіх 4 толькі месяц як у Наркамгандлі, а рэшта — 6 мес., 9 мес. і больш.

Заявы вылучэнцаў аб сваёй рабоце сьведчаць аб тым, што ні адміністрацыя, ні партыйная ячэйка, ні мясцком не зьвярнулі на работу з вылучэнцамі належнай увагі. Вылучэнцы ніякай дапамогі, як з боку спэцыялістых, так і з боку партыйных адказных таварышоў не атрымліваюць.

Тав. **Каланіцкая** (вылучэнка з чыгункі) працуе на пасадзе інспэктара на імпарце. Праз тры дні пасьля пачатку работы кансультант Наркамгандлю па пытаньнях імпарту т. Юнгэрц пайшоў у адпачынак і т. Каланіцкай прыйшлося аднэй адказваць на складаныя паперы.

Вылучэнцы да адказных таварышоў ня прымаваны.

Тав. **Кніпс** — вылучэнец з заводу «Беларусь» — працуе інспэктарам па мясе. Калі таварыш прышоў на работу яму далі кіпу спраў і сказалі «разьбірайся». За ўвесь час, як я працую, — кажа таварыш Кніпс, — ніхто да мяне не падыходзіў, ніхто ня цікавіўся, як я працую, ніхто ў рабоце мне не дапамог.

Тав. **Шатун** — машыністы чыгункі працуе ў якасьці інспэктара па кантролі за выкананьнем дырэктыў Наркамгандлю. Аддзел на які ён пасаджаны, знаходзіцца ў стадыі арганізацыі, працуе ён адзін і—ніякай дапамогі і кіраўніцтва:—як хочаш так і працуй. Рабочы т. **Вэнзэль** — дрэваапрацоўшчык — больш 9 месяцаў працуе ў якасьці дзяржбракера па леса-экспарце. Раней т. Вэнзэль быў прымацаваны да працаўніка Наркамгандлю — спэцыялістага Лур'е, які вельмі неахвотна знаёміў т. Вэнзэля з работай. Зараз Вэнзэль працуе самастойна.

Усе вылучэнцы падкрэсьлівалі поўную адсутнасьць якога-б там ні было кіраўніцтва з боку адміністрацыі.

Партыйная ячэйка і мясцком на працягу 9 месяцаў толькі адзін раз склікалі на паўгадзіну нараду вылучэнцаў.

Вылучэнцы адзначаюць, што трапіць да наркома з прычыны яго вялікай нагружанасьці вельмі цяжка. За ўвесь час работы новых вылучэнцаў Наркамгандлю т. Балцін ні разу з імі не гутарыў.

Сакратар партыйнай ячэйкі т. **Посьнікаў** заяўляе, што зараз ячэйкай намечана рад мерапрыемстваў па дапамозе вылучэнцам у іх рабоце. Вылучэнцы будуць разьбіты на тры групы і прымацоўвацца да наркома і яго намесьнікаў. Акрамя гэтага ўхвалены меры для прымацаваньня вылучэнцаў да спэцыялістых, якія ў парадку грамадзкага буксіру адказваюць за ўвядзеньне вылучэнцаў у курс работы. Ужыты захады да падняцьця агульнага ўзроўню вылучэнцаў.

**Р.**

## „ПРЫХОДЗЬ ЗАЎТРА"

Рабочы-машыністы віцебскага чыгуначнага вузла т. **Бужынскі** вылучаны на работу ў якасьці пракурора НКЮ. Замест таго, каб з першых дзён прыходу т. Бужынскага ў апарат НКЮ растлумачыць яму яго абавязкі, нарком сказаў: «вы прызначаецеся пракурорам НКЮ, у рабоце вам дапаможа т. Нікольскі».

Тав. Бужынскі прыступіў да работы. Працуе два тыдні, працуе месяц, а дапамогі ніякай, ня гледячы на тое, што ён некалькі раз зьвяртаўся за дапамогай да таго, ці іншага таварыша. Калі т. Бужынскі зьвяртаўся да т. **Нікольскага,** дык той увесь час адмаўляўся тым, што ён вельмі заняты і адкладваў дапамогу на заўтра. Тав. Бужынскі скардзіцца на тое, што за месяц работы ў апараце партыйная ячэйка не пацікавілася тым наколькі вылучэнец пазнаёміўся з абставінамі і з работай НКЮ.

У такіх умовах вылучэнцу працаваць цяжка. Партыйная ячэйка і кіраўніцтва НКЮ павінны ўжыць неадкладныя захады для таго, каб забясьпечыць вылучэнца належнай дапамогай у яго рабоце.

**Ф.**

Самарцы канчаюць летнюю вучобу Чыр-цы батальёну сувязі ставяць слупы

*Конкурс на лепшае прадпрыемства*

## Для БССР конкурс мае выключнае значэньне

### ВСНГ вітае прапанову сталінцаў

Адозву рабочых заводу імя Сталіна павінна і бязумоўна будзе вітаць ўся рабочая грамадзкасьць : перш за ўсё яе перадавая частка—рабочыя-ўдарнікі. Агляд работ другога году пяцігодкі для ўсёй прамысловасьці, у прыватнасьці для прамысловасьці БССР, мае выключнае значэньне таму, што напярэдадні 3-га году пяцігодкі мы павінны дакладна ведаць прычыны паасобных прарываў другога году з тым, каб зараз-жа іх зьнішчыць. Трэці год пяцігодкі для нас мае асаблівае значэньне яшчэ і таму, што ў гэты год мы павінны выканаць **у асноўным** усе прамысловыя заданьні пяцігодкі па БССР.

Абвяшчэньне 30 верасьня днём «усесаюзнай гатоўнасьці, днём сьвяткаваньня працы», намі поўнасьцю вітаецца. Кіраўнікі гаспадарчых арганізацый павінны **неадкладна-ж** пачаць падрыхтоўку да яго правядзеньня. Для гэтага трэба скарыстаць час, які застаўся, каб пакрыць прарывы, скончыць і ў асноўным прапрацаваць прамфінплян будучага году на падставе шырока разгорнутага спаборніцтва па вылучэньні «сустрэчнага прамфінпляну».

Адозва рабочых-сталінцаў яшчэ раз сьведчыць аб гэраізьме рабочае клясы, аб яе цьвёрдай волі выканаць пяцігадовы плян у магчыма цайкарацейшы тэрмін. Кіраўнікі гаспадарчых арганізацый павінны, не адстаючы ад гэтага руху, заражаючыся яго энтузіязмам, быць гатовымі ва ўсеўзбраеньні спаткаць трэці год пяцігодкі.

Пам. старшыні ВСНГБ

**М. Васкабойнікаў.**

ПАЗЫКА „ПЯЦІГОДКА—ЗА 4 ГАДЫ"

# САМЫ СЛАБЫ ВУЧАСТАК

## Аблігацыя пазыкі не дайшла да вёскі

### НІВОДНАЙ АБЛІГАЦЫІ

НЕ РЭАЛІЗАВАНА СЯРОД СЯЛЯН РАГАЧОЎСКАГА РАЁНУ

Брыгада Наркамфіну ў складзе рабочага заводу «Энэргія», працаўніка кіраўніцтва ашчадными касамі і супрацоўніка газэты «Рабочай» азнаёмілася з ходам рэалізацыі пазыкі па асобных прадпрыемствах і раёнах Бабруйшчыны.

На 20 жніўня кантрольнае заданьне па групе рабочых і служачых выканана на 74 проц., а па вясковым сэктары толькі на 16 проц. Заданьне па акрузе наогул выканана на 60 проц., а па горадзе на 70 проц., у той час, калі падпіска па горадзе павінна быць у асноўным скончана да 25 жніўня.

Камісіі садзейнасьці дзяржкредыту на Бабруйшчыне бяздзейнічаюць, акруговая і гарадзкая камісіі не зьяўляюцца арганізатарамі кампаніі. На пасяджэньні гарадзкой камісіі не заслухоўваліся даклады асобных прадпрыемстваў аб ходзе падпіскі. У гарадзкой камісіі няма прадстаўнікоў рабочых.

У некаторых раёнах рэалізацыя пазыкі зусім не праводзіцца. Так, напрыклад, Рагачоўскі раён павінен быў рэалізаваць па сялянскім сэктары 41.500 руб., а не рэалізаваў ні аднаго рубля. Бабруйскі раён рэалізаваў толькі 2 проц., Сьвіслацкі—3 проц., Парыцкі і Жлобінскі — па 9 проц.

Прычынай такога дрэннага ходу падпіскі зьяўляецца адсутнасьць усякай работы з боку вясковай грамадзкасьці, у першую чаргу камісіі садзейнасьці. У Падрэцкім, Любовіцкім, Казярыцкім сельсаветах, Бабруйскага раёну, камісіі садзейнасьці няма. Работа па рэалізацыі пазыкі сярод сялянства праходзіць самацёкам.

Рашучыя меры павінны быць прыняты ў адносінах вёскі. Трэба ажывіць работу камісіі садзейнасьці, фінансавага апарату, разгарнуць самую шырокую работу сярод сялянства, прыцягнуць да рэалізацыі бядняцка - серадняцкі актыў, калгасьнікаў і настаўніцтва. Саўгасы і калгасы павінны стаць праваднікамі пазыкі ў масы адзінаасобнікаў.

**Брыгада: МАЙЗЭЛЬ, ПАЛЕЕС, ШЭНДЭРОВІЧ.**

## „Я—ня ў курсе справы"

### Ва ўмовах бяздзейнасьці і безадказных адносін да кампаніі

Абсьледваньне ходу рэалізацыі пазыкі «Пяцігодка—за чатыры гады» на прадпрыемствах **гор. Віцебску** паказвае, што тэмай важнай справе не аддадзена патрэбная ўвага.

**Уздым і ініцыятыва працоўных мас у справе падпіскі ня былі падхоплены савецкімі і прафсэсыянальнымі арганізацыямі.**

**Гарадзкая камісія садзейнасьці паказала прыклад поўнай бяздзейнасьці і безадказных адносін да рэалізацыі.** З пачатку чэрвеня да 27 ліпеня гарадзкая камісія садзейнасьці ні разу ня зьбіралася.

Намесьнік старшыні гарсавету **Баркоўскі,** зьяўляючыся старшынёю гарадзкой камісіі садзейнасьці, ні разу ня быў на цасяджэньні камісіі.

У свой час для лепшага абслугоўваньня гарадзкога насельніцтва, усе прадпрыемствы і ўстановы былі прымацаваны да пэўных крэдытных устаноў.

Але апошнія ня сур'ёзна аднесьліся да сваіх абавязкаў. Быў рад выпадкаў зрыву сходаў, на якіх стаяла пытаньне аб пазыцы.

Па віне загадчыка 135-га аддзяленьня ашчадкасы **Міркіна** быў сарваны сход на пабудове швэйнай фабрыкі. Другі раз туды быў пасланы работнік Дзяржбанку **Сямельнікаў,** але і ён на сход не зьявіўся.

22-га жніўня была склікана гарадзкая камісія садзейнасьці, пасяджэньне назначылі на 12 гадз. дня, тады калі рабочыя — члены камісіі заняты на прадпрыемствах. З 12-ці членаў камісіі на пасяджэньне зьявілася 4, з 7 прадстаўнікоў прадпрыемстваў, выкліканых для дакладаў, прышло толькі 3.

На пасяджэньні былі заслуханы даклады заводу «Чырвоны Мэталіст» і броварy імя Бэбэля. Прадстаўнікі гэтых заводаў нічога не маглі сказаць, апроч голых лічбаў. Але з адказаў па некаторыя пытаньні відаць, што рэалізацыя пазыкі на гэтых прадпрыемствах да апошняга дня не набыла патрэбных тэмпаў і што падпіска праходзіць без усякага ўдзелу заводзкіх камісій садзейнасьці. Нам. старшыні заўкому заводу мэтпрому № 1 тав. **Машэйка** заявіў, што ён наогул ніякіх вестак аб рэалізацыі пазыкі ня мае.

Рад прадпрыемстваў Віцебску значна адстае ў рэалізацыі пазыкі. З 2158 рабочых фабрыкі «Дзьвіна» падпісалася толькі 928 на суму 25.000 руб. пры двухтыдневым заработку ў 54.000 руб. Партыйная і камсамольская арганізацыі фабрыкі ў справе рэалізацыі пазыкі пляліся ў хвасьце мас. Пры фабрыцы «Дзьвіна» ёсьць аддзяленьне ашчадкасы № 5. Гэта каса абслугоўвае 3028 рабочых, але яна ахапіла падпіскай толькі 1463 чалавекі. Калі ў загадчыка касы Кашчэева запыталіся, што зроблена касай у адносінах рэалізацыі пазыкі, ён адказаў: «Я — ня ў курсе справы, зьвярнецеся да кантралёра».

Наогул, па горадзе падпіскай ахоплена толькі 74,5 проц. рабочых і служачых.

Прэзыдыум гарадзкога савету не рабіў ніякай праверкі работы гарадзкой камісіі садзейнасьці і ня прыняў мер да ажыўленьня яе работы.

Не заключаны зусім дагавор на сацыялістычнае спаборніцтва з Менскім гарсаветам, які выклікаў Віцебскі гарадзкі савет.

Усе гэтыя факты гавораць аб тым, што рэалізацыя пазыкі знаходзіцца паза ўвагай мясцовай грамадзкасьці, што ўся работа ідзе самацёкам.

**Брыгада: рабочы зав. «Энэргія» АСЬМІН.**
**ад Наркамфіну БАЛІЦКІ.**
**супрац. «Зьвязды» Я. СЬНЕЖНЫ.**

Месячнік самаправеркі беларусізацыі Фрунзаўскага раёну

## ДА МЕСЯЧНІКА—БЫЦЬ ПАДРЫХТАВАНЫМІ!

### Пачын Фрунзаўскай партарганізацыі—у іншыя раёны!

Налёт рабочых брыгад на рад менскіх прадпрыемстваў і ўстаноў — па праверцы становішча беларусізацыі — выявіў буйныя прарывы ў гэтай справе. У асноўным яны заключаюцца: у невыкананьні часткай рэкэтыў партыі аб правядзеньні беларусізацыі; у недаацэнцы з боку раду партыйных і прафсэсыянальных арганізацый палітычнага значэньня беларусізацыі; у значным паспабленьні і адставаньні тэмпаў беларусізацыі некаторых прадпрыемстваў і ўстаноў; у зусім нездавальняючай пастаноўцы кіраўніцтва і паспабленьня штодзённай праверкі практычнай работы па беларусізацыі; у наяўнасьці фактаў грубага парушэньня дырэктыў партыі і ўраду па беларусізацыі; цярпімасьць да асобных вялікадзяржаўных выпадаў да беларусізацыі (ВСНГ, Дом Ураду, пошта); у казённых адносінах з боку некаторых камуністых — кіраўнікоў устаноў да правядзеньня беларусізацыі.

Фрунзаўскі РК КП(б)Б у мэтах узмацненьня тэмпу беларусізацыі — ухваліў 3 20-га ЖНІЎНЯ ПА 20-га ВЕРАСЬНЯ ПРАВЕСЬЦІ МЕСЯЧНІК САМАПРАВЕРКІ БЕЛАРУСІЗАЦЫІ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЙ І ЎСТАНОЎ РАЁНУ.

У задачы месячніку ўваходзіць правесьці ШЫРОКУЮ МАСАВУЮ ПРАВЕРКУ СТАНОВІШЧА БЕЛАРУСІЗАЦЫІ па ўсіх прадпрыемствах раёну. У аснову самаправеркі будзе пакладзена дасканалая праверка выкананьня пастаноў па пытаньнях беларусізацыі, вызначаных тэрмінаў па вывучэньні беларускай мовы, пераводзе арганізацый на беларускую мову ва ўсёй масавай рабоце і ўжываньня яе ў штодзённым жыцьці, значнае пашырэньне распаўсюджваньня беларускай літаратуры і газэт, арганізацыя рэгулярнай работы па ліквідацыі няпісьменнасьці ў галіне беларусізацыі і забесьпячэньня кантролю над выкананьнем усіх дырэктыў па беларусізацыі.

23-га жніўня пры Фрунзаўскім РК КП(б)Б адбылася нарада сакратароў парт'ячэек і камуністых, працуючых у культасьветных установах па пытаньнях беларусізацыі.

На нарадзе былі даны канкрэтныя паказаньні па правядзеньні месячніку.

Для кіраўніцтва гэтай справай у некаторых установах і прадпрыемствах, нарада прымацавала брыгадзіраў, якія сумесна з партарганізацыямі павінны тэрмінова прыступіць да разгортваньня справы па вывучэньні беларускае мовы.

Пытаньні, зьвязаныя з правядзеньнем месячніку самаправеркі стану беларусізацыі — павінны быць абгаворваны на сходах парт'ячэек.

Навакол задач месячніку павінна быць мабілізавана пралетарская грамадзкасьць.

**П. СКОКАЎ.**

# ПЕРАД БАЯВОЙ ПРАВЕРКАЙ

## Каапэрацыя, Чырвоны Крыж, ТПР вядзеце падрыхтоўку па-ўдарнаму

Ва ўсёй сыстэме падрыхтоўкі грамадзкіх арганізацый да манэўраў, вялікія і адказныя задачы стаяць перад каапэрацыяй.

На леташніх манэўрах наша каапэрацыя ў асноўным даволі ня кепска абслугоўвала манэўруючыя часьці. Праўда былі недахопы, паходныя ларкі не пасьпявалі за часьцямі, стацыянарныя ларкі бывалі ў баку ад галоўнага напрамку войск і таму страўся перарыў у забесьпячэньні байцоў.

У гэтым годзе, у сувязі з некаторым часовым напружаньнем у пытаньнях забесьпячэньня, каапэрацыйныя органы павінны пабудаваць выразную, правільную і роўнамерную сыстэму разьмеркаваньня. Каапэрацыі загадзя трэба распрацаваць падрабязны плян забесьпячэньня, выходзячы з колькасьці прадуктаў якія ўжо маюцца, агульнай колькаснасьці манэўруючых часьцей і працяжнасьці манэўраў. Трэба дакладна разьлічыць нормы, наладзіць забесьпячэньне часьцей, каб яно было бесьперабойным, каб кожны ўдзельнік манэўраў мог атрымаць сваю долю нармаваных прадуктаў.

Уся сыстэма перасоўных і стацыянарных ларкоў, сталовак, дадатковых баз забесьпячэньня павінна быць гібка перабудавана, каб ёю можна было ўмела манэўраваць і своячасова абслугоўваць спажыўца.

Новым у рабоце каапэрацыі будзе тое, што манэўры будуць праводзіцца ва ўмовах бесьперапыннага апэрацыйнага часу. Гэта патрабуе адпаведнай напярэдняй растлумачальнай работы сярод ўсіх удзельнікаў манэўраў, якія накіроўваюцца грамадзкімі арганізацыямі, асабліва-ж сярод работнікаў каапэрацыі. Такім чынам пытаньне падбору людзей таксама трэба вырашыць так, каб для работы на манэўры былі накіраваны тыя, хто ведае сваю справу, выносьлівыя і праверваныя работнікі.

Вялікую карысьць на мінулых манэўрах прынесьлі арганізацыі Чырвонага Крыжу і Поўмесяца. Яны паказалі сваю поўную баявую гатоўнасьць, узоры прыкладнай работы

Маючы ужо даволі вялікі вопыт цыі Чырвонага Крыжу і Поўмесяца будуць зноў прыцягнуты для абслугоўваньня вайсковых часьцей гарбатнямі, амбуляторыямі, пунктамі медыцынскае дапамогі, лазьнямі, эвакуацыяй хворых і раду іншых відаў садзейнасьці ваенна-санітарным і органам забесьпячэньня Чырвонай армії.

У гэтым годзе «РОКК» павінен паказаць яшчэ большую арганізаванасьць, яшчэ большую выразнасьць работы.

Ёсьць яшчэ арганізацыя, якая прымала ў мінулыя гады актыўны ўдзел у манэўрах — гэта т-ва Прыяцеляў Радыё. Маючы ўжо даволі вялікі вопыт у сумеснай рабоце, улічыўшы недахопы мінулых гадоў і выніччыўшы іх, радыё-аматары — кароткахвалявікі зноў увальюцца ў рады часьцей сувязі манэўруючых злучэньняў. Члены ТПР будуць працаваць або на адным з баку манэўруючых часьцей, або будуць абслугоўваць галоўнае кіраўніцтва манэўрамі.

Аднак члены ТПР не павінны забываць і другой галіны сваёй работы — шырокую папулярызацыю радыё шляхам абслугоўваньня радыё-ўстановак, якія будуць весьці ў раёне манэўраў палітыка - асьветную работу

Да манэўраў засталося некалькі тыдняў. Усю падрыхтоўку да манэўраў грамадзкія арганізацыі павінны весьці паўдарнаму, для чаго трэба шырока разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва паміж раённымі грамадзкімі арганізацыямі, паміж шэфскімі і сутаварыскімі часьцямі Чырвонай арміі з фабрыкамі і заводамі, узяўшы на сябе пэўныя абавязацельствы.

Асабліва трэба будзе разгарнуць сацспаборніцтва і ўдарніцтва сярод пешасрэдных удзельнікаў манэўраў. Правільна кіраванае сацспаборніцтва і ўдарніцтва дасьць максымальныя вынікі ў справе павышэньня сваёй баявой вывучкі і атрыманьня з манэўраў найбольшай карысьці.

На манэўрах Чырвоная армія, сумесна з грамадзкімі арганізацыямі і ўсёй пралетарскай грамадзкасьцю прадэманструе сваю гатоўнасьць да абароны пралетарскае дзяржавы.

Падшэфнікі ваенізуюцца. Абучэньне стральбе

# Прыкладны статут

**пасёлкавага сельска-гаспадарчага вытворчага т-ва, распрацаваны Усесаюзным Саюзам Саюзаў сельска-гаспадарчай каапэрацыі і ўхвалены Наркамземам СССР 25 жніўня 1930 году**

Разьдзел I

### Мэты і задачы

1. Беднякі і сераднякі сёл такога-та раёну, такой-та вобласьці (краю), рэспублікі такой-та, добраахвотна аб'яднаюцца ў насілковае таварыства, каб сумеснымі сіламі і сродкамі палепшыць і разьвіць сваю гаспадарку, падвысіць прадукцыйнасьць сваёй працы, арганізаваць начатковую пераапрацоўку і збыт сваёй прадукцыі і тым павялічыць таварнасьць сваёй гаспадаркі, дабіваючыся агульнага ўздыму сельскае гаспадаркі і паляпшэньня свайго матар'яльнага становішча і, такім чынам, змагацца з кулацкай эксплёатацыяй, з беднасьцю, цемнатой і адсталасьцю дробнай распылёнай адзінаасобнай гаспадаркі. Таварыства, ставіць сваёй задачай разьвіцьцё і ўздым усіх галін сельскае гаспадаркі сваіх сяброў, зьвяртаючы галоўную ўвагу на разьвіцьцё такой-та галіны, як асноўнай і паказальнай для данага раёну.

2. Для дасягненьня гэтых мэт таварыства: а) праводзіць мерапрыемствы для ўсямернага пашырэньня пасеваў сваіх сяброў і падвышэньня ўраджайнасьці, паляпшае пахаць і лугавую зямлю, уводзіць палепшаныя спосабы апрацоўкі зямлі, правільны севазварот, ужываньне складаных машын, трактараў, чыстагатункова насеньня, угнаеньня і сродкаў барацьбы са шкоднікамі, заключае вытворчы дагавор з бліжэйшай МТС, устанаўлівае і вытварае ў гаспадарках сваіх сяброў агра-і зоа-мінімум; б) забясьпечвае сваіх сяброў насеньнем, сельгасмашынамі і прыладамі, мінэральным угнаеньнем, сродкамі барацьбы са шкоднікамі і іншымі неабходнымі для гаспадаркі, сродкамі вытворчасьці і матар'ялямі; в) разьвівае тэхнічныя культуры, пладаводзтва; г) разьвівае гаспадарку сваіх сяброў і арганізуе ў прадпрыемствах таварыствы разьвядзеньня жывёлы і птушкі, набывае племянныя вытворцаў; арганізоўвае палепшаныя скотныя двары, сіласаваньне кармоў, інкубаторы, птушынькі, пункт рассаднікі, праводзіць вэтэрынарныя мерапрыемствы і г. д.; д) атрымоўвае крэдыты для вытворчых мэт і выкарыстоўвае іх для арганізацыі грамадзкіх прадпрыемстваў і вытворчай дапамогі сваім сябром; е) арганізуе збыт сельска-гаспадарчых прадуктаў гаспадаркі сваіх членаў на грунце кантрактацыйных дагавораў з дзяржаўнымі і каапэрацыйнымі арганізацыямі; ж) арганізуе і вядзе самастойна, ці сумесна з іншымі калгасна-каапэрацыйнымі аб'яднаньнямі прадпрыемствы па начатковай пераапрацоўцы сельгаспрадуктаў, арганізоўвае майстэрні па рамонту сельгас. інвэнтару, машын, зернаачышчальныя пункты і г. д.; з) арганізуе на грамадзкіх пачатках пабудову гаспадарчых прадпрыемстваў і іншых пабудоў; і) стварае ў мэтах страхаваньня ад неўраджаю і бязкорміцы грамадзкія насенныя і кармавыя запасныя фонды; к) арганізуе ўзаемадапамогу сваіх сяброў, асабліва дапамагаючы батрацтву і беднаце; л) вядзе работу па падвышэньні культурна-палітычнага ўзроўню сяброў т-ва; м) паляпшае бытавыя ўмовы жыцьця сяброў т-ва, у асаблівасьці дзяцей і жанчын. Свае мерапрыемствы т-ва праводзіць усямерна разьвіваючы грамадзкую самадзейнасьць сваіх членаў, арганізуючы вытворчыя нарады для абгаварэньня важнейшых пытаньняў сваёй работы, праводзячы сацспаборніцтва як паміж членамі т-ва, так і паміж іншымі таварыствамі, калгасамі і г. д.

Разьдзел II.

### Пра сяброў таварыства і пра іх абавязкі

3. Прыём у сябры таварыства робіцца праўленьнем, якое ўносіць у сьпіс панава прынятых членаў на зацьвярджэньне бліжэйшага агульнага сходу. Сябрамі таварыства могуць быць усе працоўныя, якія дасягнулі 16-ці гадовага ўзросту; кулакі і ўсе асобы, пазбаўленыя выбарчых праў у саветы, у сябры т-ва ня прымаюцца. Выключэньне з гэтага правіла дапускаецца для сяброў тых сем'яў, у складзе якіх маюцца алданыя справе савецкай улады —чырвоныя партызаны, чырвонаармейцы і чырвонафлётцы (радавыя і камандны склад), сельскія настаўнікі і настаўніцы, пры ўмове іх паручэльства з сяброў сваёй сям'і.

4. Усе сябры таварыства даюць абавязак падпарадкавацца патрабаваньням статуту, пастановам агульнага сходу і праўленьня т-ва, акуратна выконваць абавязацельствы па кантрактацыі і правілы вядзеньня гаспадаркі, якія ўстанаўліваюцца таварыствам. За ўхіленьне ад выкананьня абавязацельстваў, прынятых таварыствам, за парушэньне ўставу і пастаноў т-ва, за бесгаспадарчыя адносіны да каапэрацыйнай маемасьці—вінаватыя падлягаюць спагнаньням па ўстаноўленых агульным сходам правілах, аж да выключэньня іх з таварыства і звыш таго—яны абавязаны зьвярнуць прынесеныя імі таварыству страты.

5. Членамі таварыства, якія набываюць ці выключаюцца са складу т-ва, утвараецца разьлік па скончэньні гаспадарчага году, пры чым ім зварочваюцца іх паявыя ўносы і належачыя ім ад т-ва сумы, за вылікам страт, якія выпадаюць на іх долю і неаплачаных да таго часу па запазычанасьці т-ву.

Разьдзел III

### Сродкі таварыства

6. Кожны сябра таварыства павінен унесьці ўступны і паявы ўносы: батракі ўносяць адзін рубель уступнага і 5 руб. паявога ўносу; беднякі, вызваленьні ад сельска-гаспадарчага падатку, уносяць два рублі ўступнага і 10 руб. паявога ўносу і астатнія сябры т-ва—3 рублі ўступнага і 25 руб. паявога ўносу. Для батракоў і маламоцных гаспадарак т-ва устанаўліваецца растэрміноўку па аплаце паявых узносаў. Другія і наступныя (у парадку паступленьня) сябры сялянскага двара, пры ўступленьні ў т-ва ўносяць толькі ўступны ўзнос і вызваляюцца ад выплаты паявога ўносу. Для асоб, асноўнай крыніцай прыбытку якіх зьяўляецца заработная плата, паявы ўзнос устанаўліваецца ў залежнасьці ад іх зарплаты ў памеры ад 10 да 25 руб. з дапушчэньнем растэрміноўкі і ўступны ўзнос у памеры ад 1 да 3 руб.

7. Для абсталяваньня вытворчых прадпрыемстваў (жывёлаводных двароў, пракатных пунктаў і інш.) і ажыцьцяўленьня іншых буйных гаспадарчых мерапрыемстваў т-ва, агульны сход членаў можа ўстанаўліваць дадатковыя зваротныя і беззваротныя ўносы, ці арганізаваць грамадзкія работы сваіх сяброў.

Разьдзел IV

### Кіраваньне справамі таварыства

8. Справамі т-ва кіруе агульны сход сяброў і праўленьне. Калі скліканьне агульнага сходу з прычыны вялікага ліку сяброў т-ва сустракае цяжкасьці, агульны сход замяняецца сходам упаўнаважаных.

9. Агульны сход (ці сход упаўнаважаных) зьяўляецца вышэйшым органам праўленьня т-ва. Ён выбірае праўленьне і рэвізійную камісію, зацьвярджае для іх інструкцыі, разглядае і зацьвярджае каштарыс прабыткаў і выдаткаў, а таксама пляны дзейнасьці таварыства, догавары аб кантрактацыі, аб сацспаборніцтве і разьвязвае ўсе іншыя важнейшыя пытаньні дзейнасьці таварыства.

Агульны сход (ці сход упаўнаважаных) сапраўдны пры наліччы ня менш паловы членаў. Пастановы агульнага сходу (ці сходу упаўнаважаных) прыймаюцца простай большасьцю галасоў.

10. Праўленьне выбіраецца агульным сходам на адзін год у складзе ня менш 3-х членаў і 2-х кандыдатаў да іх. Праўленьне зьяўляецца выканаўчым органам таварыства, кіруе ўсімі яго справамі і робіць справаздачу аб сваёй дзейнасьці перад агульным сходам (ці сходам упаўнаважаных) ня менш 2-х раз у год.

11. Праўленьне абавязана весьці рахункаводзтва па формах, устаноўленых Райкаапсаюзам.

12. Рэвізійная камісія правярае дзейнасьць праўленьня, ў прыватнасьці нагляд за статутам, выкананьне каштарысу, выкананьне вытворчага плану, дагавораў і абавязацельстваў, робіць рэвізію касы, маемасьці, дакумантаў і справаздачнасьці, дае заключэньні па гадавых справаздачах і падсправаздачна ў сваёй дзейнасьці перад агульным сходам (ці сходам упаўнаважаных) аб кожнай рэвізіі. Рэвізійная камісія выбіраецца на 1 год у складзе 3-х членаў і 2-х канд. да іх.

Разьдзел V

### Узаемаадносіны каапэрацыйнай сыстэмы

13. Таварыства ўваходзіць сябрам у такі-та райкаапсаюз і вядзе сваю работу пад яго непасрэдным кіраўніцтвам. Таварыства заключае з райкаапсаюзам умову аб

# ГЭРОІ СВАЁЙ ЗВАНІЦЫ...

## ...ПЛЯНАВАМУ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЮ ГАРАДОЎ ПРОЦІСТАЎЛЯЮЦЬ ПЛЯНАВАЕ РАЗБАЗАРВАНЬНЕ ПРАДУКТАЎ

## КАНКУРЭНЦЫЯ, ГАНДЛЯРСТВА, ПРЭМІЯВАНЬНЕ ДЫБАМ ДЭЗАРГАНІЗУЮЦЬ МЯСАЗАГАТОЎЧЫ ФРОНТ

*Работай па-бальшавіцку, ударам па апартуністычных справах і практыцы даб'емся бесьперабойнага забесьпячэньня рабочых цэнтраў*

## Як „арганізуецца" зрыў мясазагатовак

Не «аб'ектыўнымі прычынамі», а галавацяцтвам і безадказнасьцю рэгулюючых і загатоўчых арганізацый тлумачыцца дрэнны ход загатовак мяса. Гэта сьцьвердзіла абсьледваньне мясных раёнаў БССР: Старобінскага, Глускага Петрыкаўскага, Нараўлянскага, Кацыльскага і г. д., праведзена брыгадай ЦКК-РСІ і пракуратурай.

### Хаос у плянавасьці і справаздачнасьці

Колькі загатоўлена мяса ў жніўні—на гэта зусім звычайнае пытаньне Белмяса 26-га жніўня не магло даць адказу.

Пляны мясазагатовак складаюцца мэханічна, бяз усякага ўліку мясцовых магчымасьцяй і рэсурсаў. Рад раёнаў значна перавыканалі свае ліпеньскія пляны. Замест таго, каб на жнівень павялічыць пляны апартуністы з акруговых кантор Белмяса і каапэрацыі паменшылі заданьні. Раённыя арганізацыі, таксама ня ўжылі ніякіх захадаў па пераглядзе плянаў і, далі мажлівасьць Глускім, Старобінскім, і Копыльскім каапэратарам адпачываць на лаўрах і выконваць «з перавышэньнем» пляны, якія ў шматлікіх выпадках зьяўляюцца перапаменшанымі мінімум на 50 проц.

Трэба тэрмінова пераглядзець усе пляны. Мясныя раёны, у першую чаргу **Мазыршчыны, Бабруйшчыны і Меншчыны** павінны адгукнуцца на выклік Старобінскіх загатоўшчыкаў, якія **прынялі сустрэчны загатоўчы плян супроць апартуністычнага пляну іх цэнтру, павялічыўшы яго на 25 проц.**

Хаотычнасьць у плянаваньні мясазагатовак даходзіць да таго, што раёны ня ведаюць сваіх заданьняў. Лепшым прыкладам можа быць Пятрыкоўскае спажывецкае т-ва, якое лічыла, што яго заданьне за 3-ю квадру—8 тон, а ў сапраўднасьці яно было 57 тон. Ні каапэрацыя, ні Белмяса ня здолелі вызначыць сапраўднае заданьне для багатага мясам Петрыкава.

За апошні месяц справа яшчэ пагоршылася: плянавы апарат зусім не падрыхтаваўся да ліквідацыі акруг і пасобныя спажывецкія т-вы засталіся без заданьняў. Вось, прыклад, Ляскавіцкае і Кастрычніцкае спажывецкія т-вы мелі заданьні ў чэрвені і ліпені па 6 тон і іх добра выканалі. На жнівень чамусьці гэтыя спажыв. т-вы не атрымалі ніякага заданьня і з гэтай прычыны загатовілі толькі 10-20 проц. ліпеньскай загатоўкі. Раённыя арганізацыі, з мэтай утойваньня лічбаў аб выдатканым мясе, зусім не пасылаюць ніякай справаздачы. Мазырскае аддзяленьне Белмяса ня мае вестак ад 70 проц. раёнаў. Ніхто ніякіх захадаў ня ўжыў, і рэгулячыя загатоўчыя цэнтры і надалей застаюцца ў поўнай несьвядомасьці адносна сапраўднага становішча з загатоўкамі і выдатканьнем мяса.

### Гандлярства і канкурэнцыя

«Нэпманскі душок» спажывецкай каапэрацыі моцна адчуваецца ў мясазагатоўках. Каапэратары ўпарта не жадаюць выдаваць прэміяльных фондаў для здатчыкаў жывёлы малжывкаапэрацыі. У Старобіне выявіўся такі факт: спажывецкае т-ва мела 80 пар ботаў і, ня гледзячы на гэта, адмовілася выдаць малжывкаапэрацыі боты для прэміяваньня. Пасобныя здатчыкі малжывкаапэрацыі ходзяць па 3-4 тыдні за абяцанай прэміяй. На Бабруйшчыне адзін селянін 5 раз хадзіў за прэміяй за 35 кілёмэтраў і атрымаў пару ботаў толькі 20 жніўня, у той час, калі ён здаў жывёлу яшчэ 24 ліпеня.

Каб спыніць гэта шкодніцтва ў справе прэміяваньня, трэба тэрмінова увесь фонд прэміяльных тавараў перадаць райгандлям, а покуль што райвыканкомам, з мэтай правільнага яго разьмеркаваньня паміж пасобнымі загатоўшчыкамі.

Канкурэнцыя даходзіць да вялізарных памераў. Мяса загатаўляюць нават такія арганізацыі, якія на гэта ня маюць права. Так, напрыклад, местачковы калгас «Рэвалюцыйны Выбух» закупляе жывёлу для забесьпячэньня мясам пасобных калтасьнікаў і плаціць на 40 проц. даражэй, за канкурэнцыйных цэн. Яўрэйскі калгас «Серп» загатаўляе таксама жывёлу і забівае яе выключна на «кошэр».

У БССР ёсьць спэцыяльная арганізацыя, якая павінна сачыць за недапушчэньнем канкурэнцыі і гандлярства з боку савецкіх і каапэрацыйных устаноў. Гэта—Белмяса, але-ж яно да гэтага часу нічога не зрабіла. Трэба калёным жалезам выпаліць гэты гандлярскі нарост--спадчыну капіталістычнага гандлю.

Белмяса праявіла таксама непаваротлівасьць у справе рэгуляваньня цэн. Папудная цана за бычка, вагой у 4 пуды, аднолькавая як і за 18-ці пудовага вала. У выніку сялянства і калгасы ня маюць ніякага стымулу для адкорму жывёлы. Гэта адмоўна адбіваецца на ходзе загатовак буйнай жывёлы, асабліва ў мясных раёнах Мазыршчыны і Бабруйшчыны, дзе шмат буйнай жывёлы. Тое самае з прэміяваньнем: за жывёлу вагой у 5 пудоў селянін атрымлівае адноўкавую прэмію, як за жывёлу ў 18 пудоў.

Загатоўшчыкі Старобінскага раёну заявілі прадстаўніку ЦКК-РСІ, што пры адпаведнай дыфэрэнцыяцыі цэн **загатоўку можна было-б значна павялічыць.** Хіба-ж, для Белмяса, і гэта перашкода зьяўляецца «аб'ектыўнай»...

### Плянавае разбазарваньне мяса

Трэба эканоміць мяса. Гарады нават не атрымліваюць сваёй абмежаванай нормы. Аднак, гэта не перашкаджае Белмясу, Белкаапсаюзу і іх акруговым канторам даваць такія нарады мясцом на выдатканьне мяса, якія пры ўсім жаданьні раёнамі ня могуць быць скарыстаны. Вось прыклады. Глускае спажывецкае т-ва атрымала нарад на выдатканьне ў жніўні 1.300 кілёграм мяса, але за 25 дзён жніўня выдаткавана толькі 424 кілёграмы. Тое самае ў Чырвонай Слабадзе і ў самім Мазыры. Зразумела, што такое шкоднае разьмеркаваньне нарадаў бясспрэчна стымулюе за лішнія выдаткаваньні мяса.

Фактаў перавыдаткаваньня мяса звыш нарадаў выяўлена шмат. Копыльскі раён перавыдатканаў за ліпень тону мяса. Пятрыкоўскі за красавік-жнівень 5 тон мяса. Чым, калі не нядбайнасьцю райвыканкому, Белмяса і каапэрацыі, можна вытлумачыць тое, што Старобінское спажывецкае т-ва, пачынаючы з чэрвеня, перавыдатковае штомесячна тону мяса і ніхто на гэта не рэагуе?

Яшчэ адна ілюстрацыя безадказнасьці. Чырвонаслабодзкі райвыканком 2-га жніўня заслухаў даклад аб дзейнасьці каапэрацыі па мясазагатоўках. Пастановы РВК на гэтым дакладзе былі пасланы толькі праз 3 тыдні сельсаветам і загатоўчым арганізацыям,—у той час, калі брыгада ЦКК ужо абсьледвала мясазагатоўкі.

Пляны мясазагатовак зусім рэальныя. Трэба зьнішчыць пасобныя праявы галавацяцтва, трэба прымусіць раённыя арганізацыі адчуваць адказнасьць за дастаўку мяса ў гарады для рабочага забесьпячэньня. Трэба тэрмінова мабілізаваць групу адказных партыйных работнікаў на работу ў мясных раёнах па загатоўцы мяса.

**Верба.**

БССР мае магчымасьць забясьпечыць гарадзінай і фруктамі ня толькі свае, але і іншыя рабочыя цэнтры. Нажаль, бязьдзейнасьць загатоўчых і каапэрацыйных арганізацый прыняла да такога становішча, што ў каапэрацыі пустыя паліцы, а рабочы спажывец прымушаны купляць гародніну і фрукты ў прыватнікаў.

## ПАПЯРОВАЕ КІРАЎНІЦТВА, ГАНЕБНЫЯ ТЭМПЫ

### НІЗОЎКА ПРАДАСТАЎЛЕНА САМА САБЕ

### 50% членаў праўленьня Белкаапсаюзу і цэрабкопаў у адпачынку

*Брыгада УсеЦСПС і Цэнтрасаюзу пачала абсьледваньне работы Белкаапсаюзу і раённых спажывецкіх таварыстваў. Сёньня мы зьмяшчаем першыя ўражаньні брыгады аб рабоце Белкаапсаюзу*

### Толькі ў пратаколах

Яшчэ 13-14 чэрвеня праўленьне Белкаапсаюзу прыняло рад пастаноў па падрыхтоўцы да хлебазагатоўчай і плодагароднай кампаніі. Былі ўнесены каштоўныя прапановы аб засолцы, закваскі і хаваньні плодагародніны.

Як-жа Белкаапсаюз праводзіў у жыцьцё ўсе гэтыя пастановы?

На жаль, усё засталося толькі ў пратаколах праўленьня Белкаапсаюзу. Адсутнічаюць якія-б там ні было весткі аб тым, як разгорнута работа па сыстэме спажывецкай каапэрацыі, якія ёсьць недахопы па мясцох і ў чым яны выяўляюцца. Зразумела, што Белкаапсаюз, ня ведаючы становішча нізоўкі, ня мог і кіраваць ёю.

Для ліквідацыі акруг Белкаапсаюз зусім ня быў падрыхтаваны, яна захапіла сыстэму спажывецкай каапэрацыі зьнянацку. Раёны зараз зусім адарваны ад цэнтру. У раёны дасылаюцца струмяні папяровых цыркуляраў, якія суперэчаць адзін другому. Усё гэта толькі блытае нізоўку.

### Загатоўка грыбоў сарвана

Сыстэма спажывецкай каапэрацыі ня справілася з задачамі на загатоўцы і забесьпячэньні гарадоў.

Ня гледзячы на тое, што Беларусь зьяўляецца жывёлагадоўчым раёнам, Белкаапсаюз ганебна ня выканаў плянаў на кантрактацыі і загатоўцы жывёлы. Так, плян кантрактацыі і загатоўкі буйнай жывёлы выканалі толькі на 27,3 проц., цялят — на 5,6 проц., сьвіней на 28 проц., сьвінаматак — на 2,8 проц. і сьвіней на бэкон — на 0,5 проц.

Ня лепш праходзіць загатоўка плодагародніны, грыбоў і фруктаў.

Да загатовак грыбоў спажывецкая каапэрацыя зусім не падрыхтавалася. Сваячасова ня былі вызначаны загатоўчыя і сушыльныя пункты, адсутнічае тара, работнікі і т. д. Зусім ня было ніякага інструктажу як загатаўляць, залоўваць і адгружаць грыбы. У выніку—тая невялікая колькасьць грыбоў, якая і была загатоўлена сыстэмай, у большай часьці прывозілася ў гарады самасавапай.

Характэрны прыклад, Крупянінская спажывецкае т-ва адчыніла загатоўчы грыбны пункт. У якасьці загадчыка быў запрошаны відомы спэкулянт—пазбаўленец Шпунт. Ён умудрыўся так павесьці загатоўку, што 31 бочку грыбоў прышлося закапаць у зямлю. Праўленьне раённага спажывецкага т-ва ня ведала і ня цікавілася ходам грыбных загатовак.

Замест намечаных 850 тон грыбоў, на 23 жніўня сыстэмай Белкаапсаюзу загатоўлена толькі 170 тон.

Такое-ж становішча мы маем і з загатоўкай іншых прадуктаў.

### Для раскачкі—патрэбна 8 дзён

Прарывы ў забесьпячэньні Менску бульбай, сьведчылі якіх мы нядаўна былі, гавораць аб тым, што нізоўка зусім не адчувае тэй вялікай адказнасьці, якую яна нясе па забесьпячэньні гарадоў. 11-га жніўня Белкаапсаюзам была дадзена тэрміновая тэлеграма аб цяжкім становішчы забесьпячэньня Менску бульбай і аб неадкладнай адгрузцы. Толькі 19-га жніўня спажывецкія таварыствы прыступілі да адгрузкі. **8 дзён патрэбна было нізоўцы для таго, каб раскачацца і выканаць важнейшае палітычнае заданьне.**

Цьвёрдага пляну забесьпячэньня насельніцтва гарадоў агародзінай **Белкаапсаюз да апошняга часу ня меў.** Толькі 23 жніўня быў складзены плян, які ўсё яшчэ ня ўзгоднен з дырэктыўнымі органамі. Плян прадугледжвае агульную патрэбу гарадоў у 148 тыс. тон агародніны. Гэта колькасьць зможа забясьпечыць толькі патрэбы гарадоў першай і другой групы. Рэшта гарадоў павінны зараз-жа заняцца самастойнай зьбіраннавай загатоўкай, інакш ім пагражае зрыў забесьпячэньня гародзінай.

Падрыхтоўка да захаваньня агародніны праходзіць вельмі дрэнна. Так, Менск, які перавысіў плян будаўніцтва новых сховаў, нічога не зрабіў для скарыстаньня ўсіх магчымасьцяй па рамонце старых памяшканьняў і адшуканьні новых.

Толькі зараз Белкаапсаюз 1 МЦРК вядуць гутаркі аб арганізацыі хаваньня агародніны ў насельніцтва. **Ніякай работы на фабрыках і заводах па мабілізацыі шырокай грамадзкасьці вакол пытаньня захаваньня агародніны ня было.**

### Прыгарадныя гаспадаркі зноў пад пагрозай

Асабліва дрэнна з прыгараднымі гаспадаркамі. Яны павінны зьявіцца галоўнейшай крыніцай забесьпячэньня рабочых гарадоў. Непаваротлівасьць спажывецкай каапэрацыі з аднаго боку і злачынныя адносіны Наркамзему і гарсаветаў да пытаньня аб адводзе вучасткаў — з другога, сарвалі будаўніцтва прыгарадных гаспадарак у бягучым годзе. Позны адвод зямель прывёў да таго, **што з 1300 га было цэрабкопамі засеяна толькі 900 га, з якіх агародныя культурамі 730 га.**

Будаўніцтва прыгарадных гаспадарак і зараз яшчэ знаходзіцца пад пагрозай.

Паводле дырэктыў ураду, адвод вучасткаў і замацаваньне іх за каапэрацыяй павінна было быць скончана не пазьней 5-га жніўня. Сваячасовы адвод вучасткаў даў-бы магчымасьць каапэрацыі падрыхтаваць пасеньне, інвэнтар і будаўніцтва. **Да гэтага часу ні адзін гэктар зямлі каапэрацыі яшчэ ня вызначаны.** Наркамзем два разы зьнімаў з павесткі дня паседжаньня СНК гэта пытаньне.

Пытаньне выдзяленьня зямель пад прыгарадныя гаспадаркі павінна быць неадкладна вырашана, інакш важнейшая задача па забесьпячэньні гарадоў агародзінай будзе зноў сарвана.

Асеньняя пасеўная кампанія праходзіць бяз удзелу Белкаапсаюзу. Нізоўка на сёнешні дзень не атрымала ні адной дырэктывы, ніводнага паказаньня аб мэтадах удзелу сыстэмы спажывецкай каапэрацыі ў правядзеньні асеньняй сёўбы.

### Што патрабуе брыгада УсеЦСПС и Цэнтрасаюзу

Падагульваючы вынікі абсьледваньня, брыгада УсеЦСПС і Цэнтрасаюзу канстатуе, што Белкаапсаюз ня здолеў перабудаваць сваю сетку, ня здолеў паставіць работу па-баявому. У выніку, мы маем перабої ў рабочым забесьпячэньні **Менску, Віцебску і Гомелю.**

Для ліквідацыі ўсіх гэтых недахопаў, брыгада УсеЦСПС і Цэнтрасаюзу лічыць неабходным правесьці рад тэрміновых мерапрыемстваў.

Трэба зараз-жа мабілізаваць 1 выслаць у раёны 70 чалавек, якія павінны зрушыць з мёртвага пункту работу раённых спажывецкіх т-ваў. Арганізацыйна - масавы сэктар Белкаапсаюзу трэба ўзмацніць патрэбнымі кадрамі.

Брыгада адначасова лічыць неабходным, **каб усе члены праўленьня Белкаапсаюзу і цэрабкопаў, якія знаходзяцца ў адпачынку і на курортах (да 50 проц. усіх членаў праўленьня) зараз-жа былі адазваны і прыступілі да выкананьня сваіх абавязкаў.**

Арганізацыйна - масавая работа, якая да гэтага часу была ў загоне, павінна быць шырока разгорнута як у горадзе, так і на вёсцы. Каапэрацыйны і прафэсыянальны актыў павінен быць шырока ўцягнут у практычную работу па мабілізацыі сродкаў, транспарту, тары, арганізацыі развозкі агародніны на дом і г. д.

Неабходна неадкладна праверыць як выконваюцца т-вамі пляны загатовак і мабілізацыі сродкаў насельніцтва. Шляхам уцягненьня ў практычную работу шырокіх мас беднаты і батрацтва трэба дабіцца зьнішчэньня ўсіх недахопаў, якія мелі месца да гэтага часу.

* * *

Учора брыгада УсеЦСПО выехала ў Бабруйскі, Аршанскі і Гомельскі раёны для праверкі работы каапэрацыі на мясцох. Пасьля прыезду ўдзельнікі абсьледваньня выступяць з дакладамі на прадпрыемствах Менску аб праведзенай імі рабоце.

Ударніца калгасу «Зямля і праца» убірае капусту з агароду

## РСІ папярэджвае

Гэтымі днямі аб'яднанае насяджэньне прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б і калегіі НК РСІ заслухала даклад аб становішчы рабочага забясьпечаньня ў г. Віцебску.

У вынесенай рэзалюцыі ўхвалена даручыць пракурору рэспублікі тэрміновa накіраваць памочніка ў Гарадоцкі раён для расьсьледваньня фактаў распродажу с.-г. прадуктаў загатоўчымі арганізацыямі і калгасамі, а таксама для расьсьледваньня заявы Белмяса аб забароне раённымі арганізацыямі вывазу бракаванай жывёлы. Вінаватых асоб прапанавана прыцягнуць да суровай адказнасьці.

Віцебскім арганізацыям і праўленьню ВЦРК прапанавана працягваць чыстку і арабачэньне апарату ЦРК. Белсадсаюзу прапанавана зьняць з работы ўпаўнаважанага **Прудаткова** за наўважлівыя адносіны да рабочага забесьпячэньня.

Выкому старшыні гарсавету т. **Дзякаву** за бюракратычныя адносіны да арганізацыі грамадзкага харчаваньня і безініцыятыўнасьць у адшуканьні мясцовых рэсурсаў абвешчана вымора.

Адзначаючы бязьдзейнасьць Белкаапсаюзу ў галіне сваячасовага выкрыцьця прарываў у віцебскім ЦРК і грунтоўным паляпшэньні яго работы, **пасядзжэньне ўхваліла абвясьціць вымову праўленьню Белкаапсаюзу,** а аб пасобных вінаватых у віцебскай справе мецгутарку пры зацьверджаньні вынікаў чыстці апарату Белкаапсаюзу.

Белкаапсаюзу прапанавана тэрмінова камандыраваць у Віцебск двух адказных працаўнікоў для дапамогі повараму кіраўніцтву ЦРК у рэарганізацыі апарату і паляпшэньні яго работы, для высьвятленьня на месцы ступені выкананьня нарадаў па заводзе.

Усе арганізацыі папярэджваюцца, што за ігнараваньне, або несваячасовае выкананьне партыйных і ўрадавых дырэктыў па рабочым забесьпячэньні, за бязьдзейнасьць і безініцыятыўнасьць у адшуканьні мясцовых рэсурсаў вінаватыя асобы будуць прыцягвацца да суровай партыйнай і крымінальнай адказнасьці.

## Белплодагароднiна зрывае

### ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЕ РАБОЧЫХ ГАРОДНІНАЙ

Урадам была створана спэцыяльная дзяржаўная ўстанова—**Белплодагароднiна,** якая павінна была заняцца рэгуляваньнем рынку агародніны, сачыць за выкананьнем даных заданьняў загатоўчым арганізацыям і дапамагчы каапэрацыі наладзіць бесьперабойнае забесьпячэньне рабочых.

Як-жа Белплодагароднiна выконвае ўскладзеныя на яе абавязкі?

Пачнем на парадку.

Штаб Белплодагароднiны, ня гледзячы на сваю грамадзкасьць (52 чал.), нядзольны выконваць задачы, якія на яго ўскладзены. **У апарат прапезьлі чыноўнікі і бюракраты.**

Вось характарыстыка некаторых работнікаў Белплодагароднiны. Сакратар юрысконсульт — **Краўзэ** ня член саюзу, вычышчаны з калегіі абаронцаў; эканамісты **Фундылер,** ніколі нідзе апроч сваёй уласнай пікарні, эканамічных ведаў не атрымліваў. Сярод працаўнікоў Белплодагароднiны шмат вычышчаных з іншых устаноў.

Дзякуючы работе такіх «супрацоўнікаў», лісты, тэрміновыя цыркуляры і нарады замест Магілева сыстэматычна дасылаліся ў Віцебск, замест Гомеля ў Мазыр і г. д. Дайшло да таго, што акруговая нарада ўпаўнаважаных Белплодагароднiны адзначала, што засылка лістоў зьяўляецца звычайным фактам, які зрывае работу.

У Белплодагароднiне зусім адсутнічае якая-б там ні была грамадзкасьць, самакрытыка і дысцыпліна. Цікава адзначыць, што да гэтага часу ва ўстанове няма мясцкому. Усе артыкулы, якія друкуюцца ў нашых газэтах аб рабоце Белплодагароднiны, не абгаварваюцца супрацоўнікамі і ніхто на іх не рэагуе.

Ня лепшыя адносіны да справы і кіраўнікоў установы. Дырэктар Белплодагароднiны тав. **Гейнэ** знайшоў магчымым пайсьці ў адпачынак зараз, у часамай напружанай работы на загатоўцы агародніны і забесьпячэньні працоўных садавінай і агародніной. Арганізацыя новых сушыльных печак і скарыстаньне старых праходзіць вельмі марудна, у той час, калі мы павінны былі наладзіць на іх работу ў тры зьмены.

Ня лепш абстаіць справа з арганізацыяй квасільных і засолачных пунктаў. Калі ня будуць прыняты тэрміновыя меры, мы станем перад пагрозай зрыву закваскі і засолкі.

Адпаведныя арганізацыі павінны ўзмацніць апарат Белплодагароднiны. На работу Белплодагароднiны трэба зьвярнуць больш увагі, вызваліўшы лепшых рабочых на кіруючую работу.

**Арк.**

Замест таго, каб займацца пытаньнямі рэгуляваньня забесьпячэньня гарадоў БССР і прамысловых цэнтраў агародзінай, замест таго, каб сачыць за сваячасовым і поўным выкананьнем парадаў на адгрузку, Белплодагароднiна займалася гандлем і самастойнымі загатоўкамі. Гэтым самым дэзарганізавалісь загатоўкі агародніны.

Цікавы факт, які сьведчыць аб мэтадах работы Белплодагароднiны. Адзіт Менскага аддзяленьня Белплодагароднiны прыехаўшы у калгасы Барысаўскага раёну, дзе дагавараўся аб падвозе ў Барысаў капусты. Старшыня РВК званіў у Белплодагароднiну, што калгасьнікі падвезьлі два вагоны капусты: стаяць цэлы дзень і ніхто ў іх гэтай капусты ня прымае.

Зусім не прапрацавана пытаньне забесьпячэньня загатовак тарай. Не хапае тары для ўсіх відаў агародніны і садавіны. Ні якіх мер да мабілізацыі падрыхтоўкі патрэбнай тары Белплодагароднiна ня прыняла.

Надзвычай вялікае значэньне набывае зараз перапрацоўка і сушка плодагародніны. Пры правільнай пастаноўцы гэтай работы мы маглі-б паладзіць забесьпячэньне насельніцтва сушанай садавінай і агародніной. Арганізацыя новых сушыльных печак і скарыстаньне старых праходзіць вельмі марудна, у той час, калі мы павінны былі наладзіць на іх работу ў тры зьмены.

Ня лепш абстаіць справа з арганізацыяй квасільных і засолачных пунктаў. Калі ня будуць прыняты тэрміновыя меры, мы станем перад пагрозай зрыву закваскі і засолкі.

Адпаведныя арганізацыі павінны ўзмацніць апарат Белплодагароднiны. На работу Белплодагароднiны трэба зьвярнуць больш увагі, вызваліўшы лепшых рабочых на кіруючую работу.

**Арк.**



## Вопыт „сустрэчнага" у Старобіне

Старобіншчына — важнейшы раён мясазагатовак у Бабруйскай акрузе. «Старобінскі раён выконвае свае заданьні здавальняюча» — адзначаецца заўсёды ў справаздачах акруговых арганізацый. І сапраўды ў ліпені спажывецкая каапэрацыя выканала з пляну ў 15 тон — 13, а малочная каапэрацыя з пляну ў 8 тон — 11.

Зразумела, што загатоўчыя арганізацыі павінны былі-б улічыць параўнаўча добрыя вынікі ліпеньскіх загатовак і ў жніўні яшчэ больш напружыць сілы. Але па жнівень Старобін чамусьці атрымаў значна меншы плян: малжывкаапэрацыя выканала за ліпень 11 тон, а атрымала на 10 тон. Аб тым, што такі плян на жнівень зьяўляецца недаацэнкай магчымасьцяй Старобінскага раёну, сьведчыць наступны факт. Прадстаўнік ЦКК склікаў загатоўшчыкаў, каб абмеркаваць пытаньне аб ходзе загатовак. Высьветліўшы, што гэты плян можна значна павялічыць, ён падаў прапанову аб прыняцьці **«сустрэчнага» павялічанага загатоўчага пляну. Загатоўшчыкі згадзіліся і павялічылі добраахвотна свой плян з 28 тон да 35 тон.**

Абсьледваньне Старобінскага раёну паказала, што гэты «сустрэчны» плян зусім рэальны, — трэба толькі зьнішчыць рад перашкод на шляху загатовак, напрыклад, агідна - гандлярскія адносіны спажывецкай каапэрацыі да прэміяваньня здатчыкаў жывёлы малочна - жывёлагадоўчай каапэрацыі, незацікаўленасьць і безініцыятыўнасьць раённых і сельскіх арганізацый і г. д.




У разьмеркаваньні мяса ёсьць шмат злачынных фактаў. Старобінскі раён выдатканаў **за апошнія тры месяцы 3170 кілёграм мяса замест дазволеных яму 1250.**

Загатоўленае для рабочых буйных гарадоў мяса ішло па забесьпячэньне пасобных грамадзян мястэчка па цісульках членаў праўленьня і нават пасобных прыказчыкаў крам каапэрацыі. Мы падаем здымак 2-х такіх запісак, выбраных з масы ў некалькі сот. Мяса выдавалася нават ня членам саюзу, дамаўласьнікам і г. д. Вось гэрої разбазарваньня мяса ў Старобіне: **Цярэшчынка** — старшыня праўленьня спажывецкага т-ва, члены праўленьня **Грынфельд, Гольдберг,** загадчык мясным складам **Брыкман** і прыказчык **Пракаповіч.** Справа аб гэтых асобах перадаецца пракурору для тэрміновага прыцягненьня іх да судовай адказнасьці.

Старобіншчына раён жывёлагадоўлі, таму мы зацікавіліся становішчам жывёлагадоўлі ў калгасах. Вось што выявілася: калгас «Палеская Зорка», на які былі ўскладзены вялікія надзеі, як на буйную малочна-жывёлагадоўчую гаспадарку, гэтых надзей пакуль што зусім ня спраўдзіў. У калгасных хлявох знаходзіцца 57 дойных кароў і 35 цялят трохмесячнага ўзросту. Але гэта жывёла такая зморапая, што ледзь стаіць на нагах. У выніку—каровы даюць штодзённа толькі 165 літраў малака, г. зн. менш чым каровы мясцовых адзінаасобных гаспадарак. Цяляты таксама зморaны і маюць карлікавы ўзрост. Цяжка знайсьці цялё, якое-б мела 50 кілё жывой вагі. Ніякага догляду за жывёлай няма, бо жывёлавод, які ёсьць у калгасе, скарыстоўваецца, як чорнарабочы.

**ЗАМЕСТ 28—35**

**Нарада мясазагатоўшчыкаў Старобінскага раёну ўхваліла сустрэчны загатоўчы плян, павялічыўшы яго на 25 проц.**

**Старобінцы выклікаюць пасьледваць іх прыкладу загатоўшчыкаў Петрыкава, Нароўлі, Любані.**

Раённым арганізацыям трэба тэрмінова заняцца жывёлагадоўчымі калгасамі і прыняць рэальныя меры да зьнішчэньня ўсіх недахопаў.

Побач з такімі агідцымі зьявішчамі ёсьць радасныя факты з працы іншых калгасаў у галіне жывёлагадоўлі, яны зьяўляюцца сапраўды добрым прыкладам для вакольнага адзінаасобнага сялянства. У калгасе «Новае Жыцьцё», дзе добра даглядаюць жывёлу, прадукцыйнасьць яе параўнаўча здавальняючая. Жывёлавод тав. **Курбыка** сумленна працуе і позьняй почцу наведвае хворую жывёлу. Варта ўвагі, таксама, рашэньне 400 членаў Мажурскага малочнага т-ва, якія ў парадку сацспаборніцтва здаюць 400 сьвінаматак для ўкамплектаваньня сьвінога пагалоўя калгасаў—**з кожнай адзінаасобнай гаспадаркі па адзіз сьвінаматцы для калгасу.**

Гэта добрая ідэя. Але-ж раённыя арганізацыі не аказваюць ніякай дапамогі гэтаму таварыству і адданаму сваёй справе старшыні тав. Далідаву. Да гэтага часу малочнае т-ва не атрымала ні аднаго граму прамтавараў для прэміяваньня здатчыкаў сьвінаматак.

**В—а.**

## ПРУДЫ БЕЗ ВАДЫ

### БЕЛРЫБА БЯЗ РЫБЫ

### АРГАНІЗАЦЫЯ ПРУДАВЫХ ГАСПАДАРАК ЗЛАЧЫННА ЗРЫВАЕЦЦА

Зразумела, што для паслабленьня часовых харчовых цяжкасьцяй правільная арганізацыя рыбнае гаспадаркі, рацыяналізацыя рыбных багацьцяў, мае вялізарнае значэньне.

У БССР ёсьць усе магчымасьці для разьвіцьця саджалкавай гаспадаркі. У першую чаргу, зразумела, трэба аднавіць тыя саджалкавыя гаспадаркі, што раней належалі абшарнікам, і якія можна зараз скарыстаць. Галоўную ролю ў гэтым павінна адыграць Белрыба.

Трэба сказаць, што цяпер Белрыба з гэтай работаю спраўляецца вельмі слаба. Вось факты.

Саджалкавая гаспадарка «Чырвоная Зорка» (Мазыршчына, Жыткавіцкі раён), якая павінна на бліжэйшы год даваць вялікую колькасьць пасадачнага матар'ялу — малькоў, карпа — на палову разбурана. Большасьць саджалак не мэліяравана, не ванпавана; паогул толькі 20 проц. гэтых саджалак знаходзіцца пад вадой. Тут, зразумоўна, вінаваты былы рыбаводны аддзел НКЗ, які праводзіў на гэтай гаспадарцы розныя досьледы, ня цікавячыся паляпшэньнем самой гаспадаркі.

За час існаваньня Белрыбы можна было зрабіць шмат чаго. У «Чырвоную Зорку» на працягу 9-ці месяцаў выяжджалі 3-4 разы спэцыялістыя —рыбаводы. І ні адным з іх ня быў складзены канкрэтны плян аднаўленьня гэтае гаспадаркі. У выніку замест 1.300.000 малькоў, якіх меркавалася мець обэта, мы маем усяго каля 750.000 іх.

Ня лепей справа і ў саджалкавай гаспадарцы пры калгасе «Палянка» —той жа акругі. Дзякуючы ініцыятыве калгасьнікаў, сёлета з саджалак «Палянкі» удасца атрымаць да 15 тон карпаў, але адсутнасьць увагі і кіраўніцтва ў гэтым напрамку, як з боку Белрыбы, так і Белпаляводсаюзу, прымушаюць думаць, што большасьць гэтых саджалак пры асеньніх паводках разбурыцца і зьнікне.

У Калдубіцкім с/савеце, Бягомльскага раёну ёсьць некалькі вазёр. Адно возера займае 750 га; мала чым менш за яго і іншыя. Але ніякіх арцеляй па рыбаводству там няма. Кожны рыбак ловіць сабе рыбу і прадае спажывецкай каапэрацыі, у якой, у сваю чаргу, няма ніякіх вытворчых пляна...

За тры месяцы ад рыбакоў было скуплена праз прадстаўніка спаж. каапэрацыі 5.238 кгр. рыбы. Частку адправілі ў Барысаўскі ЦРК, а 2.511 кгр. выдаткавана на месцы, паводле дазволу старшыні праўленьня Бягомльскага спаж-т-ва.

Прыяжджаў аднойчы прадстаўнік Белрыбы, склікаў агульны сход сялян, але так нетактычна паставіў пытаньне загатоўкі рыбы, што справа скончылася нічым.

10 жніўня прыехаў прадстаўнік Барысаўскага ЦРК — т. Каган і таксама склікаў сход і запісаў 10 чал. у арцель. Арцель аформілася, абрала рэвізійную камісію, але да сёнешняга дня да практычнае работы ня прыступіла. Ні РВК, ні сельсавет ні разу не заслухалі інфармацыі аб рыбным лове. Ніхто не кантраляваў бынога арандатара возера — цяпер прадстаўніка спажывецкай каапэрацыі (ліпэнца)...

А між тым, рыбаю, што вылаўліваецца з вазёр Калдубіцкага с/савету, можна было-б забясьпечыць некалькі гарадоў...

Нікуды ня варта пастаўлена рыбная гаспадарка і ў Лепельскім раёне. Там 4.500 га вазёрнае плошчы. Большасьць яе не скарыстоўваецца для лоўлі рыбы з прычыны таго, што шмат якія вазёры запушчаны і парасьлі бадаю. Ніхто не аварочвае ўвагі на ўпарадкаваньне гэтых прыродных багацьцяў.

Яшчэ дагэтуль квітнее браканьерства. Сярод насельніцтва не вядзецца выхаваўчае работы аб задачах рыбнае гаспадаркі. Калгасьнікі і сяляне-адзінаасобнікі ня ведаюць пра законы, што існуюць наконт рыбалоўства.

Усё гэта выклікае драпежніцкі спосаб лову. А гэта прыводзіць да зьбядненьня вазёр.

Лепельскія раённыя працаўнікі на чале з Сампрамсаюзам і Белрыбай ў студзені г. г. арганізавалі арцель, якой паводле пляну належыць даць дзяржаве 195 тон рыбы. Поруч з гэтым трэба было паклапаціцца і аб пабудове студняў. На жаль, пра студні забыліся і цяпер зрываецца плянавае заданьне толькі таму, што няма лёду. 55 тон рыбы не атрымае горад з прычыны галавацяцтва работнікаў з Белрыбы.

Магчымасьць пабудовы студні, бязумоўна, была. Для гэтае справы патрэбны былі невялікія сродкі, але ўсё гора ў нізкавокасьці. А з-за таго, што бракуе лёду, ужо сапсавалася і выкінута 7 цэнтнэраў рыбы.

Нельга не зазначыць, што Саюзрыба дагэтуль ніякага кіраўніцтва ў галіне арганізацыі саджалкавай гаспадаркі не дае. Неабходна, каб наваколі правільнай пастаноўкі работы ў гэтых гаспадарках неадкладна была складзена адпаведная грамадзкая думка.

**Юр.**

# Аб арганізацыі органаў КК РСІ ў раёнах

(Пастанова Прэзыдыуму ЦКК, узгодненая з ЦК УсеКП(б)

1. Ва ўсіх арганізацыях, дзе маюцца раённыя і гарадзкія камітэты, неабходна стварыць шляхам выбару на раённых і гарадзкіх канфэрэнцыях КК-РСІ, прычым да сьцьвярджэньня адпаведнага статутнага палажэньня ЦК, рэкамэндаваць кіравацца наступным:

а) Партыйны стаж для абраньня ў КК-РСІ устанаўліваецца для раёнаў — 1 год, для гарадоў — 7 год, для рабочых, якія знаходзяцца на вытворчасьці, і для сялян, якія займаюцца сельскай гаспадаркай — 3 гады;

б) Пленум РКК, які абіраецца на партканфэрэнцыях, устанаўліваецца ў 15 чалавек для першай катэгорыі, 9 чалавек для другой катэгорыі і 5-7 чалавек для трэцяй катэгорыі. Прэзыдыум абіраецца толькі ў раёнах першай і другой катэгорыі ў колькасьці ня больш трох чалавек і кіруе работай як па партыйнай, так і па савецкай лініі. У раёнах трэцяй катэгорыі пленумам абіраецца толькі старшыня і сакратар, якія і кіруюць работай. Раённыя кантрольныя камісіі існуюць на падставе тых-жа палажэньняў, якія былі зацьверджаны раней для акруговых КК-РСІ.

2. а) У адносінах штатаў, усе раёны разьбіваюцца на тры катэгорыі ў залежнасьці ад магутнасьці раёну. Асноўнымі прызнакамі магутнасьці павінны быць: бюджэт, колькасьць насельніцтва, характар прамысловасьці, лік членаў партыі і г. д. Для першай катэгорыі раёнаў штаты сталых штатных адказных працаўнікоў устанаўліваюцца ў 5 чалавек, для другой катэгорыі — 4 чалавекі, для трэцяй 3 чалавекі.

УВАГА: 4-я група раёнаў па партыйнай сетцы прыраўніваецца да 3-й катэгорыі КК-РСІ.

б) Штаты гарадзкіх КК-РСІ устанаўляюцца ад 5 да 7 чалавек. Пленумы павінны складацца з 15-20 чалавек, прэзыдыум—з 3-х—5-ці чалавек. Штаты раённых КК-РСІ Масквы, Ленінграду, Харкава і іншых абласных гарадоў лічыць неабходным разглядзець дадаткова.

3. Працаўнікі КК-РСІ павінны аплачвацца ня ніжэй, чымся працаўнікі раённых партыйных камітэтаў.

4. Пры ліквідацыі акруговых кантрольных камісій і выканкомаў, абласныя партыйныя органы павінны зьвяртаць падбору працаўнікоў раённых КК такую-ж увагу, як і падбору раённых партыйных камітэтаў.

# Толькі 40 проц.

## Слабое паянакапленьне тармазіць работу прамкаапэрацыі

Прамысловая каапэрацыя БССР, паводле прамфінпляну 1929-30 году, павінна выпусьціць прадукцыі на 57 млн. рублёў. Па асобных галінах прамысловасьці сыстэма Белсампрамсаюзу павінна даць за год: цэглы 38 млн. штук, іншых будаўнічых матар'ялаў на 1.000.000 руб., прадукцыі па дрэваапрацоўчай прамысловасьці на 8 млн. руб., шкляной прадукцыі на 10 млн. руб., абутковай — на 11 млн. руб.

Для ажыцьцяўленьня гэтае праграмы, прамкаапэрацыя апроч фінансавай дапамогі з боку дзяржавы, мабілізуе рэзкі мас каапэраваных саматужнікаў. Паводле пляну, за бягучы год павінна было паступіць пайвых узносаў 1.620.000 руб. Апроч таго, прамкаапэрацыя БССР узяла на сябе дадатковае заданьне па выпуску прадукцыі ашчэ на 2 млн. рублёў, павялічэньні ліку каапэраваных на 7.000 чалавек і павялічэньні пайвога капіталу на 270.000 рублёў.

Як выконвае прамкаапэрацыя свае заданьні?

Валавая прадукцыя прамкаапэрацыі складае 70 проц. пляну.

Паявога капіталу сабрана за 9 месяцаў 678 тыс. рублёў, што складае 40 проц. гадавога пляну.

Зусім зразумела, што такі слабы тэмп паянакапленьня адбіваецца на ўсёй работе прамкаапэрацыі.

Між тым, мясцовыя арганізацыі Белсампрамсаюзу вельмі мала робяць для ўзмацненьня паянакапленьня.

Плян прамкаапэрацыі, паводле апошніх дырэктыў Усекампрамсавету, павялічваецца ашчэ на 2 млн. рублёў, з тым, каб ва што-б там ні стала дабіцца перавыкананьня пляну у вытворчасьці будаўнічых матар'ялаў, смалакурэньні, выпрацоўцы тары і г. д.

Гэта ўскладвае ашчэ большую адказнасьць на сыстэму прамысловай каапэрацыі.

Рэарганізацыя сыстэмы прамкаапэрацыі, ліквідацыя акрпрамсаюзаў і арганізацыя новых раённых прамсаюзаў, якія зараз праводзяцца, ні ў якім разе не павінны адбіцца на выкананьні плянавых заданьняў.

Д. Ш.

## ПРАЎЛЕНЬНЕ МЦРК „ВЫЛУЧАЕ" І „ПРАСОЎВАЕ"

Вельмі цікавы мэтад абрала праўленьне МЦРК для барацьбы з растратамі і лішкамі ў сваіх магазынах...

Яно не знайшло нічога лепшага, як прасоўваньне і вылучэньне на вышэйшыя пасады «старых спэцаў», якія пакаліся спакусе і змахлявалі некалькі сот рублёў.

Зьвернемся да фактаў. Грамадзяне Шульман і Баркан працавалі ў магазіне № 55,—адзін загадчыкам, другі—яго намесьнікам. Там аказаўся лішак у 500 руб... Лішак гэты праўленьне зарыхтавала, а «работнічкаў» перавяла на тыя-ж пасады ў магазын № 21.

У магазыне № 21 Шульман і Баркан растрацілі 468 р. 99 к... Вы думаеце, што справу перадалі ў суд? Не! У пратаколе пасяджэньня праўленьня ЦРК ад 16 чэрвеня г. г. зазначана: «утрымаць з пэнсіі»... Ціха і спакойна...

А самі вінаватыя, пасьля растраты, апынуліся на «цяплейшых» пасадах: Шульман—інструктарам МЦРК, а Баркан — у тым-жа магазыне ўжо загадчыкам...

Што-ж гэта за рука з праўленьня ЦРК цягне махляроў угару на жыцьцёвай драбіне?

Л.

## Нямецкі вучоны--пра выстаўку

26-га жніўня Усебеларускую выстаўку наведаў удзельнік міжнароднага кангрэсу глебазнаўцаў—асыстэнт Брэсцкага унівэрсытэту, доктар-інжынэр Курон.

Падрабязна азнаёміўшыся з выстаўкай, п. Курон заявіў, што яна зрабіла на яго добрае ўражаньне. У сваім водгуку аб выстаўцы п. Курон запісаў: «Выстаўка дасканала арганізавана, яна дае як мясцоваму, так і прыезджаму, поўны агляд дасягненьняў і імкненьняў Беларусі. Глебазнаўцаў асабліва цікавіць сыстэматычнае вывучэньне глебы, суадносіны спажыўных матэрый, што знаходзяць адбітак у вопытах над расьлінамі».

# Фініш усебеларускага аўтапрабегу

27-га жніўня, а 5 гадз. дня на тэрыторыі ўсебеларускай выстаўкі адбыўся фініш ўсебеларускага аўта-мота-прабегу. Удзельнікаў прабегу сустракалі члены Аўтадору, прадстаўнікі Белдзяржтрансу і прафэсыянальных арганізацый.

Прабег заняў 12 дзён. За гэты час калёна прайшла больш за 2.000 кілёмэтраў, у прабезе ўдзельнічала 4 лёгкавыя аўтамабілі, 2 грузавікі і 3 матацыклы. Прабег ішоў па маршруту Менск — Слуцак — Мар'інскі калфонд — Парычы — Мазыр — Рэчыца — Гомель — Клімавічы — Магілеў — Ворша — Асінбуд — Полацак — Лепель — Барысаў — Менск.

У паходзе прымалі ўдзел прадстаўнікі ЦК КП(б)Б, старшыня аўтадору т. Сташэўскі, прадстаўнікі Белдзяржгандлю, Наркамфіну. Удзельнікі мелі з сабой паходную рэдакцыю, кіно-перасоўку, апэратараў, спэцыялістых па дарожнай і зямельнай справе. У калгасах і вёсках былі наладжаны сходы, мітынгі, праведзены гутаркі і інш.

Сярод шофэраў 2 жанчыны, якія толькі 2 месяцы назад скончылі курсы і вельмі добра спраўляліся са сваімі абавязкамі.

## Падрыхтоўка да прызыву ў Менску

У Менскім акруговым ваенкамаце нашаму супрацоўніку паведамілі, як ідзе падрыхтоўка да прызыву 1908 г.

Галоўная падрыхтоўчая работа да прызыву ўжо скончана. Кастрычніцкі райком правёў канфэрэнцыю дапрызыўнікаў і выклікаў Фрунзаўскі райком, але апошні на выклік не адказаў.

Вядзецца растлумачальная работа з дапрызыўнікамі.

Гарадзкая камісія па клясавым адборы дапрызыўнікаў закончыла сваю работу, але працавала бяз усякай сувязі з партыйнымі, камсамольскімі і прафсаюзнымі арганізацыямі. У выніку ў армію маглі пралезьці варожыя элементы.

Так, міліцыяй выдана характарыстыка нейкаму Бранвіцкаму з вёскі Барохава, Менскага раёну аб тым, што ён зьяўляецца пралетарскім элементам, у той час, калі яго бацькі былі высланы з БССР. Сам ён ня мае права голасу.

Такая-ж даведка была выдана нейкаму Левіну, які займаецца на трэцім курсе ў Горацкай акадэміі. Таксама ня мае права голасу.

15 верасьня пачынаецца прызыў па г. Менску, а з 20-га па раёнах.

Трэба адзначыць, што савецкія ўстановы ашчэ не падрыхтаваліся да прызыву. Акруговы суд, які павінен быў даць весткі аб праве голасу дапрызыўнікаў, да гэтага часу гэта ашчэ ня выканаў. Праведзены налёт ваенкораў на савецкія ўстановы давёў, што яны ніякай падрыхтоўкі да прызыву не вядуць.

Ц.

## *Паведамленьне калегіі АДПУ*

МАСКВА, 27. Калегія АДПУ разгледзела справы групы асоб, якія займаліся скупкай і ўтойваньнем срэбнай манэты, замежнай валюты і золата. Найбольш злосных утойшчыкаў, якія займаліся разам з гэтым актыўным пашырэньнем контр-рэвалюцыйных чутак: Тайгільдзіна, Клусава, Разанцава (Ніжэгарадзкі край), Дэрэбкіна, Федасеева, Пугачова (Іванаўская вобласьць), Папова, Мартынава, Лушнікава, Волкава (Урал), у якіх знойдзены буйныя сумы разменнага срэбра, калегія АДПУ прыгаварыла да расстрэлу. Прыгавар выкананы.

# З лістоў рабселькораў

### НЕДАПУШЧАЛЬНАЯ МАРУДНАСЬЦЬ

Справа з ваннаваньнем глебы ў Чырвонаспадобскім раёне абстаіць вельмі дрэнна. Паводле пляну, патрэбна было заваннаваць у саўгасах 85 гэкт. зямлі і ў калгасах 65 гэкт. На сёньняшні дзень заваннавана толькі 20 гэкт. у саўгасах і 7 гэкт. у калгасах. Гэта—ў той час, калі ванна загатавана ў выстарчальнай колькасьці, але ніхто ня прыняў ніякіх мер да дастаўкі ванны непасрэдна ў калгасы і саўгасы.

Аналёгічнае становішча і з тарфаваньнем глебы. Райза толькі 7-га жніўня даў загад па сельсаветах правесьці месячнік тарфаваньня, а да гэтага часу тарфяная справа на раёне зусім не разгортвалася. Па пляне трэба затарфаваць 44 гэкт. зямлі. Для выкананьня гэтага покуль што, апрача складаньня плянаў, нічога ня зроблена.

І. Паўлоўскі.

### ДЗЕ-Ж ЗЯМЛЯЎПАРАДКАВАЦЕЛЬ?

Зямельная плошча камуны «Іскра» Кісьцянеўскага сельсавету, Рагачоўскага раёну раскідана на адлегласьці 7 кілёмэтраў. Выходзячы з гэтага, праўленьне камуны ня раз зварачалася ў РВК, каб апошні правёў зямляўпарадкаваньне камуны. Гэтыя просьбы засталіся на паперы. РВК на сёньняшні дзень яшчэ ня прыслаў зямляўпарадкавацеля.

Такія адносіны з боку Рагачоўскага РВК да камуны ставяць пад пагрозу зрыў асеньняй сяўбы, бо камуна чакае зямляўпарадкавацеля і ніякай падрыхтоўкі да сяўбы не праводзіць.

Камунар.

### КУРСЫ ПАД ПАГРОЗАЙ ЗРЫВУ

У Бабруйску арганізаваны курсы рэдактароў шматтыражак і насьценных газэт. Пры арганізацыі гэтых курсаў ніхто не паклапаціўся аб забесьпячэньні нармальных умоў для работы курсаў. Наглядаюцца вялікія прарывы ў галіне практычнае работы ў рэдакцыі. Зараз заняткі курсаў зусім спынены з тае прычыны, што выкладчыкі, якія павінны былі прыбыць з гор. Менску, не зьявіліся.

Курсант.

### ПРОДАСІЛІКАТ НЯ ВЫКОНВАЕ НАРАДАЎ БЕЛКААПСАЮЗУ

Ня гледзячы на пастанову ЦК КП(б)Б аб забесьпячэньні збожжазагатовак прамтаварамі, у тым ліку і сілікатнымі і на шматлікія просьбы Белкаапсаюзу, Продасілікат ня прыняў ніякіх мер да ліквідацыі недагрузак нарадаў Белкаапсаюзу 2-й і 3-й квадры. Усяго недагрузе тавараў Продасілікатам складае на суму 350 тыс. руб. Па адной гаспадарчай пасудзе невыкананьне нарадаў складае на суму 24.000 руб.

Такое становішча з выкананьнем нарадаў Белкаапсаюзу ў часе збожжазагатоўчай і асеньняй пасеўнай кампаніі зьяўляецца недапушчальным. Згодна вестак у Аршаншыне зусім адсутнічае ваконнае паўбелае шкло, што бязумоўна адабяцца на ільназагатоўках, калі Продасілікат ня прымае свайчасовых мер да зьнішчэньня гэтых недагрузаў.

Ш. В.

### ДА АДКАЗНАСЬЦІ ЗА НЕРЭГАВАНЬНЕ НА РАБКОРАЎСКІЯ ДОПІСЫ

За апошні час шматтыражка «Гута» (гута імя Домбаля) начала выходзіць усяго адзін раз у месяц. Гэты заняпад тлумачыцца, выключна, тым, што допісы, якія зьмяшчаліся ў «Гуце», заставаліся бяз усякае ўвагі. Злачынна і бюракратычна адносіліся да рэагаваньня на рабкораўскія допісы заводзкія арганізацыі, якія за ўесь час ня далі ніводнага адказу на закранутыя пытаньні ў газэце. З-за такіх адносін да допісаў, рабкоры перасталі пісаць у газэту.

Бязьдзейнічае і рэдкалегія, якая не праводзіць ніякае работы сярод рабкораў.

Парткалектыў ня прыняў ніякіх мер да зьнішчэньня ўсіх гэтых недахопаў. Усе тыя, якія не рэагавалі на рабкораўскія допісы, засталіся ненаказанымі.

А. Жала.

### РАБКОРЫ--ІНІЦЫЯТАРЫ СУСТРЭЧНАГА ПРАМФІНПЛЯНУ

На днёх адбыўся агульны сход рабкораў абутковае фабрыкі (Менск). На агульным сходзе рабкоры ф-кі выкрылі шмат недарэчнасьцяй у рабоце прадпрыемства. Так, напрыклад, з-за нерацыянальнага скарыстаньня апалу страты дасягнулі да 10.000 руб., таксама рабочыя адзначылі, што адміністрацыя няўважліва адносіцца да вытворчасьці і г. д.

Па дакладзе тав. Фельдмана рабкоры ўхваліл распачаць падрыхтоўку да сустрэчнага прамфінпляну.

В. Ш.

### БЕЗГАСПАДАРЧАСЬЦЬ НА СТАНЦЫІ ЧАШНІКІ

«Лёгкая кавалерыя» фабрыкі «Чырвоная Зорка» зраблела абгляд—як хаваюцца матар'ялы, прызначаныя для фабрыкі на ст. Чашнікі. Пры абглядзе выявілася, што адміністрацыя ст. Чашнікі зусім няўважліва адносіцца да хаваньня матар'ялаў фабрыкі. Папяровая макулатура валяецца ў раскіданым выглядзе на складзе. Вугаль на станцыі валяецца ў пяску, што, бязумоўна, адбіваецца на яго якасьці. Такі лёс напаткаў і 50 вагонаў глінкі.

Такая безгаспадарчасьць падалей нядзіраіма.

Рабочы.

# „Зьвязда" дапамагла

* * *

Па сутнасьці допісу «Кулакі з падкулачнікамі зьнялі з работы земляўпарадкавацеля» Дубровенскія арганізацыі нас паведамілі, што такі выпадак быў. Дубровенскі нарсуд сваёй пастановай ад 28 ліпеня прысудзіў найбольш злосных да 1 году пазбаўленьня волі, а астатніх двух—на 6 і 4 месяцы прымусовых работ.

* * *

Аўтар допісу «Цёмнае гняздо» пісаў аб радзе ненармальнасьцяй у Бабруйскім Спраўдоме. Галоўныя недахопы наступныя: сродкі на каштарысе на харчаваньне зьняволеных адпускаюцца на 350 чал. у той час, як сярэдняя колькасьць зьняволеных, якая знаходзіцца на харчаваньні, складае 948 чал. Былі факты сямейнасьці, што выявілася ў павялічэньні зарплаты асобным супрацоўнікам звыш устаноўленых ставак і г. д.

Бабруйская Акр. РСІ па гэтым допісе ўжыла рад захадаў да зьнішчэньня недахопаў. Намочнік Спраўдому—тав. Мэнараў пераведзены на работу ў іншае месца.

* * *

Старшыня Гатовенскага с.-с., Заслаўскага раёну—Галушка нядбайна адносіцца да сваіх абавязкаў—так пісаў тав. Р. Заслаўскі РВК допіс падцьвердзіў і старшыня с-савету—Галушка з работы зьняты.

* * *

У № 61 газ. «Зьвязда» быў зьмешчаны артыкул «Дыплёмат з міліцыі», у якім пісалася, што міліцыянэр Говар Васіль (Мазыр) парушае міліцэйскую этыку, абараняе злачынцу бацьку і г. д. Мазырскі акруговы адмаддзел гэтыя факты пацьвердзіў і Говар Васіль загадам начальніка міліцыі і крымвышуку ад 8-га чэрвеня 1930 г. зьняты з работы.

* * *

Копыскі РК КП(б)Б нам паведаміў, што пры расьсьледваньні допісу «Машыны іржавеюць», які зьмешчаны ў № 104 газ. «Зьвязды», аказалася, што ўсе факты адпавядаюць сапраўднасьці.

Матар'ял па гэтым пытаньні дасланы сьледчаму для прыцягненьня вінаватых да адказнасьці.

# Адкрылася мастацкая выстаўка

Учора ў памяшканьні дзяржаўнага культурна-гістарычнага музэю адкрылася пазачарговая Ўсебеларуская мастацкая выстаўка.

Адкрыцьцё яе прыстасавана да Ўсебеларускай выстаўкі сельскай гаспадаркі і прамысловасьці а тым, каб даць магчымасьць яе экскурсантам азнаёміцца з дасягненьнямі беларускага рэвалюцыйнага выяўленчага мастацтва за апошніе дзесяцігодзьдзе.

Рад сваіх работ прадставілі на прагляд і ацэнку грамадзкасьці мастакі акадэмічнае школы: Волкаў, Кругер, Сьлянан, Дучыц (Менск), Пэн і Эндэ (Віцебск), Філіповіч (Масква).

Нэарэалізм прадстаўлены карцінамі мастакоў Пайна (Дуброўна), Лейтмана (Віцебск), Каўроўскага, Галубкінай, Русецкага (Гомель), Станюты і Каштэлянскага (Менск).

З «левых» у выстаўцы ўдзельнічаюць пэйзажысты Кудрэвіч і малады мастак з Гомелю Тарасікаў.

Нельга не адзначыць вельмі ўдалых работ нашых мастакоў-самавучак, якія аб'яднаны ў асобную групу. Асабліва зварачаюць на сябе ўвагу карціны старога рабочага віцебскай шчотачнай фабрыкі тав. Дайнецкага.

Значна бяднейшы аддзел разьбярства.

Разьбяры Грубэ, Азгур (Менск), Шульц (Віцебск), Шыфрын (Гомель).

Трэба адзначыць, што дагэтуль на выяўленчае мастацтва ня была зьвернута належная чыння увага партыйнае, прафсаюзнае і ўсяе савецкае грамадзкасьці. Мы яшчэ далёка не заўсёды ўяўляем сабе, што адбываецца на гэтым важнейшым вучастку культурнага фронту, у імя чаго там ламаюць коп'і прадстаўнікі розных фармальных плыняй.

Усебеларуская выстаўка павінна паказьці пачатак зусім іншым адносінам да гэтае справы.

## ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

Брыгадзіры т. т.: Левітан, Іваноў, Гілярскі, Эпштэйн, Гобэрман, Пікула, Каждан, Сульскі, Аксэльрод, Заяц і інш., якія накіроўваліся ЦК КП(б)Б і «Зьвяздой» у акругі для праверкі выкананьня дырэктыў партыі аб пасылцы 90 проц. акруговых работнікаў на работу ў раёны, павінны сёньня а 6 гадзіне ў абавязковым парадку зьявіцца у ЦК КП(б)Б (пакой № 17).

**29 жніўня а 7 гадз. увечары ў памяшканьні ФРУНЗАЎСКАГА РК КП(б)Б (3-ці паверх) склікаецца нарада наступных прадстаўнікоў ячэек: культпропаў ячэек КП(б)Б і ЛКСМБ, масавых сэктараў ячэек, сэктару па рабоце сярод жанчын, прадстаўнікоў францыў ФЗМК, францыў жактаў і прадстаўнікоў рэдкалегій насьценгазэт і шматтыражак. Парадак дня: 1. Аб правядзеньні рэдкалегій насьценгазэт і шматтыражак. 2. Аб перавыбарах дэлегацкіх сходаў; 3. Аб месячніку беларусізацыі. Яўка ўсіх вышэйпаказаных таварышоў абавязкова. Ячэйкам прасачыць за сваячасовым паведамленьнем.**

**ФРУНЗАЎСКІ РК КП(б)Б.**

— З 29 жніўня да 1 верасьня ад 7 да 9 гадз. увечары ў **Доме Асьветы** будзе адбывацца рэгістрацыя членаў і кандыдатаў партыі калектыву КП(б)Б Працасьветы, якія знаходзяцца на вучобе, а таксама ўсіх іншых, з паказаньнем дзе і хто жадае займацца.

— **Дом Асьветы.** Сёньня а 2 гадз. дня адбудзецца пасяджэньне палітасьвет. сэктару ЦП саюзу Працасьветы, на якое запрашаюцца кіраўнікі палітасьветных груп ГК і МК Працасьветы, а таксама і тыя, хто запісаўся ў добраахвотнікі.

— **Дом Асьветы.** 30-га жніўня а 7 гадз. раніцы збор асьветнікаў для паездкі ў пасёлак Запішша для прыняцьця ўдзелу ва ўборачнай кампаніі саўгасу.

— **ДОМ КАМАСЬВЕТЫ. 30 жніўня а 8 гадз. увечары адбудзецца лекцыя на тэму: «НАЙНОЎШЫЯ ДАСЯГНЕНЬНІ Ў ХЭМІІ». Пасьля лекцыі — мастацкая частка.**

— 31-га жніўня а 8 гадз. увечары даклад т. Страноўскага на тэму «Папярэднія вынікі выкананьня прамфінпляну ў 1929-30 годзе і кантрольныя лічбы на 1930-31 г. Білеты для партыйнага і камсамольскага актыву (на 30 і 31 жніўня) па РК КП(б)Б.

— **БДУ.** Заняткі на ўсіх курсах факультэту савецкага будаўніцтва і права (апроч першага) пачынаюцца з 1 верасьня. З гэтае прычыны дэканатам склікаецца нарада ўсіх навуковых працаўнікоў факультэту 30-га жніўня а 13 гадз. дня ў канцылярыі факультэту (хэмічны корпус). Яўка абавязкова.

80 жніўня а 6 гадз. увечары адбудзецца нарада ўсіх выкладчыкаў факультэту народнае гаспадаркі БДУ у памяшканьні дэканату (Унівэрсытэцкі гарадок). Яўка абавязкова.

— **МК БДУ** паведамляе, што дзень індустрыялізацыі працягнуты да 30-га жніўня. Усе працаўнікі, якія яшчэ не працавалі ў карысьць дня індустрыялізацыі, павінны зьбірацца ў свой выхадны дзень да 30 жніўня, а 7 гадз. раніцы каля мясцкому БДУ для накіраваньня на работу.

**Час. вык. абав. адказ. рэдактара А. МІТЛІН.**

Фрунзаўскі і Кастрычніцкі РК ЛКСМБ, рэдакцыя газ. «Чырвоная Зьмена» сумесна з Беларускім Штабам «У ПАХОД ЗА ПАПЕРУ»

скліканць

**30 жніўня а 7 г. веч. у памяшканьні рэдакц. газ. «Зьвязда» (Савец., 63)**

## ПАШЫРАНУЮ НАРАДУ

сакратароў ячэек ЛКСМБ, важатых піянэр-атрадаў, старшынь фарпостаў па пытаньні паходу за паперай і месячніку збору макулятуры.

ПРОСЬБА ЗЬЯВІЦЦА СВАЙЧАСОВА.

Фрунз. і Кастр. РК ЛКСМБ.
Мас. адз. рэд. газ. «Чырв. Зьмена».
Беларускі Штаб «У паход за паперу».


БЕЛДЗЯРЖТЭАТР — У чацьвер, 4 верасьня
Адзіны адкрыты спэктакль Маскоўскай Дзяржаўнай Студыі імя АЙСЭДОРЫ
ДУНКАН
У праграме вечару: танцы на музыку: Шубэрта, Шумана, Шопэна, Бэтховэна, Штрауса, Грачаніча, Глюка і інш.
Цыкл: ТАНЦЫ РЭВАЛЮЦЫІ.
Білеты прадаюцца ў касе тэатру
Пачатак а 8 г. 30 м. веч.

Кіно-тэатр „Культура" — Гэрачнал аповесьць з гісторыі Чэчні ЗЭЛІМ ХАН у 6 частках. Вытворчасьці «Усход-кіно». Пачатак сэансаў: а 7 г., 9 г., 10 г. 30 м. Каса—ад 5 гадз.

КІНО Інтэрнацыянал — Новая вясёлая камэдыя вытворчасьці «Саюзкіно» Вялікая няпрыемнасьць. Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз. Каса—ад 5 гадз.

КІНО „Пралетары" — Мастацкі фільм Начны крык. Драма ў 7 частках. Пачатак 1 сэансу а 7 г. Каса адчынена ад 5 г.

КІНО-САД — Ад ВУТОРКА, 26-га ЖНІЎНЯ Вядомы комік Дуглас Мак-Лін у лепшай замежнай камэдыі ПАЗНАЁМЦЕ МЯНЕ ў 7 частках. — Толькі 2 сэансы. — Пачатак 1-га сэансу а 9 г., 2-га—10 г. 30 м. КАСА АДКРЫТА з 6 г.

Кіно „СПАРТАК" — замежны выдатны фільм ПАТАШ І ПЭРЛАМУТР камэдыя ў 10 частках, СЁНЬНЯ. УВАГА! 4 сэансы. УВАГА! Пачатак сэансаў: 1 с.—6 г., 2 с.—7 г. 30 м. 3 с.—9 г., 4 с.—10 г. 45 м. КАСА—ад 5 гадз.

БЕЛМЭТАЛЯАБ'ЯДНАНЬНЕ адкрывае ў 1930-31 навучальным годзе ў г. Менску ФАБЗАВУЧ МЭТАЛІСТЫХ са спэцыяльнасьцямі: сьлесароў, такароў і ліцейшчыкаў. Прыём згодна даведніку НКАсьветы БССР «Правілы прыёму ў ФЗВ і прафшколы». Перавага даецца дзецям рабочых, нават ня скончыўшым 7-годкі. Прыём заяў праводзіцца выключна праз менскую біржу працы. БЕЛМЭТАЛЯАБ'ЯДНАНЬНЕ.

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР — 29, 30, 31 жніўня, 1, 2 верасьня „АВАНГАРД" п'еса ў 4-х дзеях. Б. Натаеў. Пастаноўка С. Разанава і К. Саньнікава. Мастак Ю. Гольц. Музыка В. Салалова. Дырыжэр І. Гіттарц. Кіраўнік хору М. Кауфман. Паказ ідзе С. Калпашнікаў. Пачатак роўна а 8 г. 30 м. Білеты прадаюцца ў касе тэатру у рабочай касе і на Усебеларускай выстаўцы.

Мастацкі ЦЫРК — Пад кіраўніцтвам І. Л. СТРАШЭВІЧА. Пятніца, 29 жніўня. СЁНЬНЯ! Усходнія артыстыя ЛАНГО СЁНЬНЯ! Азіацкія ілюзаністыя, муштроўшчыкі гадзюк-удаваў. З БРЭНДЗІ 3—Ролікабежцы. Ям. Ян. БОНІ—Сатырык. З МЕРАЛЬДО 3—Гладыятары. 2 КАНВАЛЬДЗІ — быт. сатырыкі. —) УСЯ ТРУПА ў ЛЕПШЫХ №№ (—. Пачатак а 8 г. 30 м. веч. Канфэрансье Е. А. Яўгенеў. Адказны кіраўнік І. Л. СТРАШЭВІЧ. АНОНС! У нядзелю, 31 жніўня ВЯЛІКАЕ ДЗЕННАЕ ЗРЭЛІШЧА для дзяцей

У панядзелак, 1-га верасьня АДЧЫНЕНЬНЕ дзіцячага кіно-тэатру „ЮНЫ ПІЯНЭР" На экране новая карціна вытворчасьці «Саюзкіно» „САПРАЎДНЫЯ ПАЛЯУНІЧЫЯ"

ЛЯЧЭБНІЦА — МЕНСКАГА ГАРАДЗКОГА КАМІТЭТУ ЎЗЕМАДА-ЛАМОГІ — Ленінская, № 25, побач з 2-м Домам Савэтаў, АДКРЫТА ад 9 гадз. ран. да 9 г. веч. Прыём хворых па ўсіх спэцыяльнасьцях: на ўнутраных, хірургічных, жаночых, вочных, хваробах вуха, горла і носа, скурана-венэрычных, страўніцкіх, нэрвовых. Электра-сьвета-лячэньне і кварц адкрыты з 11—2 гадз. дня і 5—8 гадз. увеч. Рэнтген (вдымкі, прасьвечаньні, лячэньне) адкрыт з 6 г. да 8 г. увеч. ЗУБНЫ ГАБІНЭТ адкрыт з 9 г. раніцы да 9 г. веч. штодзённа. Кансультацыя прафэсароў па ўсіх спэцыяльнасьцях па папярэднім запісе. Урачэбная дапамога на дому па ўсіх спэцыяльнасьцях. Запіс з 9 гадз. раніцы да 9 гадз. веч. Прыём хворых па лекавых кніжках камітэту Для ўсіх іншых грамадзян за агульнадаступную дыфэрэнцыяваную плату.

Галоўнае кіраўніцтва шосавых і грунтавых дарог і аўтатранспарту БССР паведамляе, што ў 1930-31 навуч. годзе ў г. Менску АДКРЫВАЕЦЦА АУТАТЭХНІКУМ тэрмінам навучаньня 2½ гады. Тэхнікум рыхтуе тэхнікаў па аўта-эксплёатацыі. Прымаюцца асобы, скончыўшыя сямігодкі або вячарнюю школу павышанага тыпу. Прыём заяў праводзіцца з 20 жніўня па 1-га верасьня ў памяшканьні 7-ай школы (Камсамольская вул. д. № 40). Прыём на агульных падставах, устаноўленых НКАсьветы для тэхнікумаў. Выкладаньне на беларускай мове. Частка слухачоў будзе забясьпечана стыпэндыяй. Галоўдортранс БССР.

ПРЫЁМ ЗАЯЎ І ІСПЫТЫ ў Бел. Дзярж. Акадэміі сельскае гаспадаркі і Бел. зоатэхнічным інстытуце (у Горках) працягваецца да 5-га верасьня. Дырэкцыя.

Абвестка аб ПРЫЁМЕ Ў 1930 ГОДЗЕ ў Гомельскі аўта-трактарны тэхнікум. Гомельскі аўта-трактарны тэхнікум, які знаходзіцца ў веданьні Галоўдартрансу БССР, абвяшчае працяг прыёму на 1 курс тэхнікуму. Тэхнікум рыхтуе тэхнікаў па аўтамабільным і трактарным рамонце, эксплёатацыі і тэхнікаў па дарожных машынах. ТЭРМІН НАВУЧАНЬНЯ 2½ гады. Жадаючыя паступіць у тэхнікум павінны падаць наступныя дакументы: а) анкету, засьведчаную належнымі арганізацыямі, б) пасьведчаньне аб стажы работы, в) аб узросьце, г) аб адносінах да вайсковай павіннасьці, д) аб адукацыі, е) аб сацыяльным і матар'яльным становішчы паступаючага і яго бацькоў, ж) даведка аб тым, што паступаючы і яго бацькі не пазбаўлены выбарчых правоў. Для асоб, якія маюць сувязь з сельскай гаспадаркай, неабходна акрамя пералічаных дакументаў прадставіць копію акладнога ліста па с.-г. падатку за 1929-30 г., засьведчаную РВК або матар'яльнай канторай, з) 2 фатаграфічныя карткі. У тэхнікум прымаюцца асобы ва ўзросьце не маладзей 16 год і ня больш 21 году, а з вытворчасьці—ня больш 30 год. Заявы прымаюцца ў канцылярыі тэхнікуму (ГОМЕЛЬ, Кааператыўная, № 68) з 18 да 20 гадз. штодзённа, а з іншых гарадоў поштай з прыкладаньнем марак на 20 кап. Апошні тэрмін прыёму заяў 5-га верасьня г. г. У тэхнікум прымаюцца: рабочыя, батракі, беднякі, калгаснікі і іх дзеці, а таксама і ўсе іншыя асобы, згодна правіл прыёму ў тэхнікумы і ВНУ, апублікаваных Наркамасьветы. Скончыўшыя 7-годку ў 1929-30 г. ад іспытаў вызваляюцца. Стыпэндыяй і інтэрнатам забясьпечваюцца ў агульным парадку. Начальнік тэхнікуму ВЕРАЦІЛАЎ.

Вышаў з друку, паступіў у продаж і рассылаецца ўсім падпісчыкам „МАЛАДНЯК" № 6-7

ЗЬМЕСТ:

Янук Колас. Папом—ваякам. П. Броўка. Прамова фактамі. Р. Мурашка. З-над напласту гадоў. С. Ліхадзіеўскі. Простае слова. П. Галавач. Сьвежы вецер. А. Лемеш. Паўстанцы. Я. Вазёрны. Пойдзем ліпнёвым маршам. А. Гараўскі. Алёнка. В. Сташэўскі. Прысяга ў лесе. Ізі Харын. Урыўкі з паэмы «Менскія балоты». Ю. Таўбін. Майму пакаленьню. Г. Арахоўская. Трыццаць постая. Ш. Росін. Вольныя палі. А. Юдэльсон. З паэмы «Негарэлае». Н. Беліна-Падгаецкі. Забастоўка.

Крытыка. Л. Бэндэ. Шлях паэты. Мік. Аляхновіч. На аванпастох пралетарскай літаратуры. Х. Дунец. Яўрэйская літаратура Беларусі да дня вызваленьня БССР. Хв. Шыніклер. Заквітнелі новыя нівы. Х. Дунец. Пра некаторыя задачы яўрэйскае пралетарскае літаратуры.

Бібліяграфія. С. Куніцкі. Андрэй Александровіч. Цені на сонцы. Н. Кабаноў. Р. Мурашка. Тысяча дзевяцьсот пяты год. Ю. Лавонны. Александр Жаров. Великое состязание. ХРОНІКА.

ПАДПІСВАЙЦЕСЯ НА ШТОМЕСЯЧНУЮ ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКУЮ ГРАМАДЗКА-ПАЛІТЫЧНУЮ ЧАСОПІСЬ „МАЛАДНЯК" 8-мы ГОД ВЫДАНЬНЯ Орган Беларускай Асацыяцыі Пралетарскіх Пісьменьнікоў

ПАТРАБУЙЦЕ ва ўсіх кнігарнях Белдзяржвыдавецтва, у каапэрацыйных крамах Белкаапсаюзу, ва ўсіх газэтных кіёсках І ЧЫТАЙЦЕ „МАЛАДНЯК" Цена асобн. нумару 40 к.

УМОВЫ ПАДПІСКІ:

| на год | на 6 м. | на 3 м. | на 1 м. |
|---|---|---|---|
| 3 руб. | 1 р. 60 к. | 90 коп. | 30 коп. |

Падпіска прымаецца: ва ўсіх паштовых аддзяленьнях, агенцтвах, ва ўсіх кнігарнях Белдзяржвыдавецтва, усімі аддзяленьнямі „Правды" і спэцыяльнымі ўпаўнаважанымі. Выд. „Чырвоная Зьмена". Падпіску можна пасылаць у Выд-ва „Чырвоная Зьмена" па адрасе: Менск,